


У РЭЙД З СУПРАЦОЎНІКАМІ ДАІ 6



ЯК ХАРЧАВАЦЦА, КАБ ВЯСНОЙ НЕ ХВАРЭЦЬ 7

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 КРАСАВІКА 2020 г.

СЕРАДА

№ 63 (29177)

# Святы Губерт паселіцца ў Гародні



Фота БелТА.

Алень святога Губерта з пазалочаным крыжам паміж рагамі красуецца на гербе Гродна і лічыцца адным з сімвалаў старажытнага горада. А ў хуткім часе ў горадзе паселіцца і яго гаспадар — скульптура святога Губерта, апекуна паляўнічых, рыбакоў і леснікоў, будзе ўстаноўлена тут да XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Над вобразам працуе вядомы гродзенскі майстар Уладзімір ПАНЦЯЛЕЕЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «Старых трэба адназначна берагчы»

Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Наталляй Качанавай абмеркаваў самыя надзённыя для краіны пытанні





Фота БелТА.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава шмат гадоў займала пасаду кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, таму яе меркаванне па шматлікіх праблемах важнае для лідара краіны. На парадку сустрэчы сярод такіх былі і эканамічныя, і сацыяльныя, і палітычныя пытанні, у тым ліку і будучыя выбары.**

### ЧЫМ НАМ КАРЫСНАЯ ФОРМУЛА ТРАМПА?

Як адзначыў сам Аляксандр Лукашэнка, прэзідэнцкую кампанію неабходна ўжо не толькі абмяркоўваць, але і планаваць. «У нас падстаў пакуль няма для таго, каб пераносіць прэзідэнцкія выбары, як некаторыя ці то ворагі, ці то сапернікі падказваюць», — заўважыў кіраўнік краіны. Для назначэння тэрмінаў на падрыхтоўку неабходна параіцца з ЦВК, зверыцца з заканадаўствам. І тут дарэчы будзе вопыт Наталлі Качанавай, якая ў Адміністрацыі займалася гэтымі пытаннямі.

Самая цяжкая праблема сёння, паводле слоў Прэзідэнта, — эканоміка. «Хоць мы і стараемся тут неяк караскацца, каб прадпрыемствы працавалі і людзі атрымлівалі заробкі. Тут мне вельмі спадабалася формула Трампа, ён шчыра сказаў: калі мы не пачнём неадкладна працаваць (звярнуўся да амерыканцаў, дзе друкуюць долар, і гэта першая эканоміка ў свеце), то людзей памрэ больш ад беспрацоўя і голаду, чым ад каранавіруса», — згадаў Аляксандр Лукашэнка і адзначыў, што ***нам неабходна працаваць і як толькі магчыма ратавацца ад гэтага крызісу***.

### ПАЎНОЧНЫ РЭГІЁН — ПАД АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛЕМ

Што датычыцца сітуацыі з каранавірусам, то Прэзідэнт выказаў меркаванне, што сёння мы знаходзімся на піку захворвання: «Я малю Бога, каб да Вялікадня гэты пік пайшоў уніз».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што даваў даручэнне старшыні верхняй палаты парламента за выхадныя наведаць Віцебск: «Вы, верагодна, адчуваеце ўсе тонкасці праблемы». Ён дадаў, што гэтая вобласць крыху адрозніваецца ад іншых рэгіёнаў па клімаце, і там крыху змясціўся пік захворванняў. Цяпер на Віцебшчыне працуюць міністр аховы здароўя і іншыя аўтарытэтныя спецыялісты.

Прэзідэнт абазначыў яшчэ адну важную праблему: усе хвалююцца з-за каранавіруса, забываючыся, што ў краіне шмат пацыентаў з іншымі хваробамі. Яны патрабуюць не меншай увагі: ***«Не трэба забываць, што ў нас ёсць і анкалагічна хворыя, і хворыя з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, у нас ёсць астматыкі, проста людзі, якія хварэюць на пнеўманію без усякіх ускладненняў».***

СТАР. 2

Жыві і квітней, Беларусь! Абеліскі параненай зямлі. Адраджэнне

## МАЦНЕЙ, ЧЫМ «ІДЗІ І ГЛЯДЗІ»

У вёсцы Боркі Кіраўскага раёна ствараецца маштабны мемарыял памяці, які перадасць увесь жах таго, што тут адбылося больш за 70 гадоў таму

**Боркі былі цалкам сцёртыя з зямлі падчас карнай аперацыі ў чэрвені 1942 года. Тую жахлівую раніцу падрабязна апісаў у сваёй дакументальнай аповесці «Карнікі» Алесь Адамовіч. Потым па ёй быў пастаўлены не менш жахлівы фільм «Ідзі і глядзі», ад прагляду якога і цяпер стыне кроў у жылах...**

### МЕСЦА СМУТКУ

Разам з жыхарамі таксама былі спаленыя пасёлкі Доўгае Поле, Закрынічча, Чырвоны Араты, Пралетарскі, Хватаўка, Дзяржынскі — усе яны знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад Борак. Сваю чорную справу фашысты скончылі да сярэдзіны дня. Пасля жахлівай зачысткі ў жывых засталося толькі 38 чалавек з амаль дзвюх тысяч.

Помнік, прысвечаны ахвярам гэтай трагедыі, упершыню з'явіўся ў Борках у 1953 годзе — салдат і схіленая ў смутку жанчына. Цяпер гэты помнік знаходзіцца на могілках, якія прымыкаюць да капліцы ў гонар іконы Божай маці «Знойдзенне загінулых». Капліца была пабудаваная тут у 2004-м з грамадзянскай ініцыятывы. Мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак у вёсцы Боркі» ўключаў у сябе таксама мемарыяльныя пліты з назвамі населеных пунктаў Магілёўскай вобласці, спаленых разам з жыхарамі, так і не аднОўленых.

СТАР. 5



Стары помнік таксама ўпішацца ў агульную канцэпцыю.

АПК

## ВЯСНОВЫЯ КЛОПАТЫ

У Гомельскім раёне працягваюць сяўбу

**Аграрыі паўднёвага рэгіёна Беларусі — Гомельскай вобласці — традыцыйна задаюць тэмп сяўбы ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур. Засеяна больш чым 90 % адведзеных плошчаў. Пасяўны клін у рэгіёне сёлета зойме каля 550 тысяч гектараў. Мяркуецца завяршыць яравую сяўбу да 9 мая. Між тым усе гаспадаркі Гомельскага раёна пасеялі раннія яравыя — ячмень і авёс. Пры спрыяльных умовах надвор'я ў найбліжэйшыя дні можна будзе прыступіць да сяўбы пшаніцы.**

СТАР. 2



**Кіраўнік аддзялення «Цярэнічы» УСП «СлаўМол» Фёдар ПРАХАРЭНКА, старшыня Цярэніцкага сельвыканкама Алена КОЗЫРАВА, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА, вядучы аграном аддзялення «Цярэнічы» УСП «СлаўМол» Юрый АДЗІНЦОЎ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СААЗ заявіла аб набліжэнні да піка заражэння каранавірусам у Еўропе




Сусветная арганізацыя аховы здароўя зафіксавала прыкметы стабілізацыі сітуацыі з распаўсюджаннем каранавіруснай інфекцыі ў Еўропе, паведаміў Bloomberg. Пасля таго як Італія паведаміла аб найменшай за апошнія два тыдні колькасці новых выпадкаў заражэння, выканаўчы дырэктар праграмы СААЗ па надзвычайных сітуацыях у галіне аховы здароўя Майк Раян заявіў, што гэтая краіна, а таксама Іспанія набліжаюцца да піка захворвання на COVID-2019. Раян адзначыў, што ўсе новыя дыягнаставаныя выпадкі інфекцыі сталі вынікам заражэння прыблізна два тыдні таму. Эксперт заклікаў усе краіны актывізаваць намаганні па пошуку і ізаляцыі пацыентаў. «Гэта не пройдзе само сабой. Нам трэба, каб краіны засяродзіліся на гэтай стратэгіі», — падкрэсліў Майк Раян.

### Сусветны банк прагназуе эканамічны рост Кітая на ўзроўні 2,3 %



У дакладзе банка прагназуецца, што Кітай, другая па велічыні эканоміка свету, «прадэманструе запаволенне росту з 6,1 працэнта летась да 2,3 працэнта сёлета». Мяркуецца, што адпаведны паказчык у краінах усходнеазіяцкага рэгіёна паменшыцца да 2,1 % у 2020 годзе з 5,8 % у 2019-м. Гэта адбудзецца пры ўмове, калі сусветная эканоміка, згодна з прагнозамі, пачне аднаўляцца гэтым летам. Як вядома, Сусветны банк выдзеліў 14 мільярдаў долараў фінансавай падтрымкі для ўзмацнення здольнасці краін, якія развіваюцца, процідзейнічаць распаўсюджванню каранавіруса і плануе выдаткаваць яшчэ 160 мільярдаў долараў на працягу наступных 15 месяцаў для абароны бедных і ўразлівых слаёў насельніцтва.

### ЕС запускае місію па кантролі зброевага эмбарга ў Лівіі

Еўрасаюз з 1 красавіка пачаў праводзіць новую місію ў Міжземным моры. Пра гэта гаворыцца ў заяве Савета ЕС. У дакуменце падкрэсліваецца, што IRINI з грэчаскай мовы перакладаецца як «мір», а яе асноўнай задачай стане ажыццяўленне эмбарга ААН на пастаўкі зброі ў Лівію з выкарыстаннем паветраных, сухапутных і марскіх шляхоў. Місія будзе выконваць і іншыя задачы — у прыватнасці, ажыццяўляць маніторынг і збор інфармацыі аб незаконным экспарце з Лівіі нафты і нафтапрадуктаў. IRINI ўзначаліць контр-адмірал Фабіа Агасціні ў якасці камандуючага аперацыяй ЕС, а штаб-кватэра місіі будзе размешчана ў Рыме.



ISSN 1990 - 763X

20063>

9 771990 763008

## КОРАТКА

• **У Беларусі створана рабочая група па распрацоўцы праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады.**

• Парад да Дня Перамогі пройдзе вечарам.




• **Лясгасы Беларусі нарыхтавалі каля 10 тысяч тон бярозавіку.**

• Штаб тэрытарыяльнай абароны будзе разгорнуты ў Астравецкім раёне.

• **Другі шунціруючы рэактар БелАЭС уключаны ў работу.**

• Мінчанін прыгавораны да трох гадоў калоніі за «мініраванне» бальніцы.

• **У Барысаве службовы сабака дапамог раскрыць падпал дома і хуліганства.**

Праект — маштабны

## РЭНЕСАНС СТАРОГА ЗАМКА

### У Гродне завяршаецца першы этап рэканструкцыі аднаго з найстарэйшых замкаў Беларусі



**Сёння яго не пазнаць. І не толькі таму, што нагадвае грандыёзную будаўнічую пляцоўку, хоць гэта сапраўды так. Можна без перабольшання сказаць: мала які гістарычны аб'ект аднаўляўся з такім размахам. І хоць работы яшчэ не завершаны, яго воблік ужо нагадвае велічны палац.**

### КАМПРАМІСНЫ КУПАЛ

Нядаўна на ўязной вежы з'явіўся бліскучы купал. Гэта адна з самых яскравых канструкцый замка. Работа над ім вялася доўгая і карпатлівая. Пра гэта можна меркаваць па памерах купала, дыяметр якога — шэсць метраў, а вышыня — восем. Напачатку быў створаны стальны каркас з драўлянай абшыўкай — менавіта на гэтай стадыі восенню мінулага года адбылася першая «прымерка» непасрэдна на самой вежы. Гэта неабходна было зрабіць, каб падагнаць усе памеры, бо работы вяліся на зямлі. Пасля таго як купал і вежа «сышліся», яго зноў знялі.

А вось канчатковы выгляд надала купалу металічная канструкцыя з медзі і волава. Гэта была цалкам ручная работа, якую выконвалі спецыялісты мінскай фірмы. І хоць цяпер існуюць сучасныя тэхналогіі вырабу падобных рэчаў, быў абраны падыход, якім карысталіся майстры ў даўнія часы. Пры гэтым металічныя пласціны накладваліся такім чынам, каб пад купал не зацякала вада. Дахавая медзь з тонкім слоем волава пакуль блішчыць, але з цягам часу пацямнее і прыме такі самы выгляд, які быў калісьці. Завяршае купал чатырохметровы шпіль.

СТАР. 8

# «Старых трэба адназначна берагчы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка ўжо валодаў сітуацыяй пра смерць пажылога акцёра тэатра з Віцебска. «У яго таксама, акрамя пнеўманіі і іншых хвароб, быў і гэты вірус, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Значыць, ***старых трэба адназначна берагчы, таму што ў іх аслаблены імунітэт і букет захворванняў***».

## САМАІЗАЛЯЦЫЯ — НЕ ПАНАЦЭЯ

Прэзідэнт падзякаваў урачам, якія вылечылі значную колькасць хворых на каранавірус, знайшлі неабходную для гэтага камбінацыю лекаў. «***Я вельмі сур'ёзна ўзяў пад кантроль работу сістэмы аховы здароўя. Сістэма створана. Сістэма павінна працаваць дакладна, як гадзіннік.*** Не магу сказаць, што яна не працуе, але мы знайшлі нямала недахопаў у рабоце непасрэдна ўрачоў. Самае страшнае для мяне, што яны самі сябе не берагуць», — канстатаваў ён, адзначыўшы выпадкі, калі ў Віцебску некалькі медыкаў заразіліся ад пацыентаў.

На яго думку, працаваць трэба кропкава, не заклікаць усіх да ізаляцыі. «***На граніцы кантралюем і будзем кантраляваць,*** — запэўніў Прэзідэнт. — ***Мы лечым там, дзе павінны лячыць. Але нельга абмяжоўваць людзей там, дзе іх не трэба абмяжоўваць***».

Аляксандр Лукашэнка абвергнуў фэйкавыя меркаванні, што ўлады падманваюць наконт сітуацыі, якая склалася ў краіне: «Мне навошта кагосьці падманваць? Я што, гэты вірус стварыў, каб нешта схаваць і людзям не паказваць?» На яго думку, не трэба рабіць катастрофу з каранавіруса, бо кожны дзень людзі вылечваюцца і пакідаюць бальніцы.

«***Кожная падзея: вайна, эпідэмія, пандэмія — гэта ўрокі. Мы многаму вучымся.*** Я асабіста кантралюю некалькі працэсаў. Рана пра гэта казаць, але я ўжо людзям гаварыў: прыйдзе час і я раскажу (са сваіх назіранняў, вашы назіранні збяру, спецыялісты скажуць). Мы паведамім пра гэтыя ўрокі», — сказаў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• У тэму**

«Ніякага пераносу выбараў не будзе», — запэўніла журналістаў Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі. Парадак будучай выбарчай кампаніі абмяркуецца з ЦВК, і тады вызначацца з іх канкрэтнай датай.

Пытанні эканомікі, якія сёння асабліва хвалююць улады, — раўнамернае развіццё рэгіёнаў, работа кожнага прадпрыемства краіны.

«Цяпер ідуць розныя размовы: закрыць прадпрыемствы ў сувязі з каранавірусам і не працаваць. Але я ў суботу выязджала па даручэнні Прэзідэнта нашай краіны ў Віцебскую вобласць для таго, каб паглядзець рэальную сітуацыю, якая складваецца з гэтай праблемай, інфекцыйнай хваробай, што прыйшла ў нашу краіну, — паведаміла яна. — У мяне былі сустрэчы і з урачамі, якія займаюцца сёння гэтай праблемай, і з вучонымі, якія займаюцца праблемамі захворванняў. І нават урачы сказалі, што абавязкова павінны працаваць прадпрыемствы».

Наталля Качанава ахарактарызавала сітуацыю з каранавірусам на Віцебшчыне як абсалютна кіраваную. І заклікала не даваць веры фэйкавым паведамленням, што вобласць закрытая для перамяшчэння.

«Сёння вырашаюцца пытанні па тэстах, па аснашчэнні медыцынскім абсталяваннем нашых устаноў. У Віцебску вызначаны бальніцы, куды шпіталізуюцца людзі з гэтым захворваннем, — дадала сенатар. — Канешне, былі пытанні, якія мелі патрэбу ў карэкціроўцы».

Па яе словах, прынята рашэнне: ва ўсіх абласных цэнтрах адкрыць лабараторыі, якія робяць тэсты на каранавірус.

Таксама Наталлі Качанавай дадзена даручэнне запрасіць да нас спецыялістаў СААЗ, каб яны далі сваю ацэнку нашай сістэме аховы здароўя.

«І тады вы пачуеце і ўбачыце, ці правільна працуе наша сістэма аховы здароўя і ці правільныя былі прыняты меры, — канстатавала яна. — Ні ў чыіх інтарэсах хаваць нешта, утойваць. Вы добра разумееце, што мы ўсе людзі і таксама не абаронены ні ад чаго. І разумеем, што павінны прымацца меры, адэкватныя той сітуацыі, якая складваецца ў краіне на гэтым этапе».

**• Кампетэнтна**

Аляксандр Лукашэнка даручыў Наталлі Качанавай звязацца з кіраўніцтвам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і запрасіць у краіну яе спецыялістаў. З чым звязана такое даручэнне кіраўніка дзяржавы, расказала прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант.

«Гэтае даручэнне звязана з тым, што мы цяпер жывём ва ўмовах у тым ліку і інфармацыйнага каранавіруса. Штодня і штогадзіны назіраем шматлікія спробы як мага мацней разгайдаць сітуацыю ў СМІ. Мы ўсё адсочваем і бачым вельмі шмат размоў, спроб дэзынфармаваць людзей, выкарыстаць сітуацыю для таго, каб падарваць давер да ўлады», — заявіла Наталля Эйсмант.

«У першую чаргу для таго, каб зняць любыя абвінавачанні і паказаць, што мы нічога не хаваем, Прэзідэнт даручыў старшыні Савета Рэспублікі неадкладна звязацца з кіраўніцтвам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і запрасіць сюды іх спецыялістаў. Прычым спецыялістаў, канкрэтна, сфарміраваную пэўную ідэю іх меркавання, — расказала прэс-сакратар. — Гэтым спецыялістам будзе прапанавана ацаніць як работу сістэмы аховы здароўя ў цэлым, так і — падкрэсліваю — цяперашнюю сітуацыю, нашы механізмы процідзеяння самым небяспечным інфекцыям. Пасля гэтага эксперты дадуць публічную ацэнку ўбачанаму — адкрыта і непрадузята. Усё гэта робіцца для таго, каб у далейшым не было ніякіх плётак».

**БелТА.**

# ВЯСНОВЫЯ КЛОПАТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам са **старшынёй Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыяй ЛАДУЦЬКА** дабіраемся да пасёлка Цярэнічы:

— Тут знаходзіцца адно з аддзяленняў сельгаспрадпрыемства «СлаўМол», — уводзіць у курс справы дэпутат. — Сяўбу ячменю завяршаюць ва ўрочышчы Лозы. Першы дзень пасля начных прымаразкаў тэхніка можа выйсці ў поле.

Вікторыя Аляксандраўна замацавана за гаспадаркай. Прыязджае, каб ацаніць аб'ём работы на палях.

— Кіраўнік аддзялення «Цярэнічы» Фёдар Прахарэнка — дэпутат Цярэніцкага сельскага Савета дэпутатаў, — тлумачыць кіраўнік райсавета. — Больш за 30 гадоў ён на гэтай зямлі, людзей ведае і мясцовасць таксама. Гэта вельмі дапамагае ў рабоце.

Фёдар Прахарэнка сустракае нас разам з вядучым аграномам аддзялення — Юрыем Адзінцовым. Едзем туды, дзе зараз працуе тэхніка. У салоне машыны аграрыі вывяраюць справаздачы: лічбы, планы, працэнты. Асляпляльна-зялёная варсістая роўнядзь поля за шклом машыны адрывае ад папер.

— Гляньце, як спорна азімыя ўзышлі, зараз пацяплее — раскусяцца, нальюцца, — заўважае Фёдар Іосіфавіч.

— Бачыце поле, якое нядаўна засеялі? Роўненька ўсё, вока радуе, для мяне няма нічога прыгажэйшага. Тут душу ўклалі ў кожны куток зямлі, — падтрымлівае гаворку аграном.

Мужчыны 40 гадоў працуюць у мясцовай гаспадарцы. Набліжаемся да ўрочышча Лозы, дзе не так даўно была паша. Потым на гэтым месцы засявалі травы для кармоў, і вось першы год тут ячмень. Зямля прайшла перадпасяўную апрацоўку. Магутны трактар пакідае свежыя баразёнкі: так пасяўны агрэгат сашнікамі задае будучыя рады каласкоў.

— Пры добрым надвор'і, калі можна ўсю змену адсеяць, праходжу 40 гектараў, — расказвае механізатар аддзялення «Цярэнічы» Андрэй Багдановіч.



Механізатар аддзялення «Цярэнічы» УСП «СлаўМол» Андрэй БАГДАНОВІЧ.

Ён цяпер імкнецца працаваць без прыпынкаў — няма часу даваць інтэрв'ю. Але ж якраз час праверыць работу насеннеправодаў пасяўнога агрэгата.

— Пасля начных прымаразкаў у поле выходзім пазней, калі сонца добра прагрэе зямлю. Машына ў мяне добрая, летась атрымалі, першы год яна на пасяўной.

Перапынкі ў механізатара цяпер толькі на яду — яе прывозяць у поле. Насенне рытмічна дастаўляюць з гаспадаркі, калі прыходзіць час. У цэлым УСП «СлаўМол» атрымала сёлета самы высокі план сярод гаспадарак Гомельскага раёна па яравой сяўбе. Веснавыя палявыя работы распачалі ў лютым: уносілі арганіку, тэхніка «закрывала вільгаць» і рыхтавала глебу да сяўбы, падкармлівалі шматгадовыя травы.

Між тым начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гомельскага райвыканкама Мікалай Лясько адзначае: вельмі важна паспець правесці пасяўную кампанію, пакуль у глебе ёсць вільгаць. Пад сяўбу асноўных збожжавых культур — ячменю і аўса, якія менш цеплалюбныя, — на тэрыторыі раёна адведзена без малога тры тысячы гектараў.

Гаспадаркі раёна пачалі сяўбу і зернебабовых культур, пад якія выдзелена 600 гектараў. На чарзе — пшаніца. Гэтая культура будзе пасеяна на 550 гектарах: 400 у УСП «СлаўМол» і 150 у КСУП «Урыцкае». У цэлым план па сяўбе яравых збожжавых культур для Гомельскага раёна — 4715 гектараў. На шасцістах гектарах пасеюць грэчку і проса. Традыцыйна вялікую частку кліна займе «царыца палёў»: пад пасеў кукурузы ў раёне адведзена 22 тысячы гектараў. Да работ з гэтай культурай гаспадаркі плануюць перайсці ў сярэдзіне красавіка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота аўтара.**

# Аб эканоміцы і ахове здароўя

**З ініцыятывы армянскага боку адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі і прэм'ер-міністра Арменіі. Аляксандр Лукашэнка і Нікол Пашынян абмеркавалі пытанні функцыянавання эканомікі ў існуючых няпростых умовах, адзначыўшы наяўныя сур'ёзныя праблемы і складанасці, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.**

Бакі абмяняліся думкамі адносна цэн на вуглевадароды, якія і Беларусь, і Арменія імпартуюць з Расіі. Аляксандр Лукашэнка і Нікол Пашынян канстатавалі завышаны ўзровень цэн на прыродны газ, адзначыўшы, што яны, відавочна, не адпавядаюць сусветнаму ўзроўню і сітуацыі, якая складваецца ў цэлым.

Асобнай тэмай гутаркі стала функцыянаванне сістэм аховы здароўя і процідзеянне распаўсюджванню сезонных вострых вірусных інфекцый.

Таксама ў сувязі з існуючым становішчам Прэзідэнт Беларусі і прэм'ер-міністр Арменіі абмеркавалі магчымасць сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў ЕАЭС для абмеркавання ўзніклых эканамічных выклікаў. З ініцыятывай аб правядзенні такой сустрэчы выступіў Аляксандр Лукашэнка як лідар краіны, якая старшынствуе ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Кіраўнік нашай дзяржавы падкрэсліў наяўнасць неадкладных пытанняў, якія патрабуюць дэталёвага абмеркавання на вышэйшым узроўні.

У развіццё размовы беларускі лідар даў даручэнне старшыні Калегіі ЕЭК Міхаілу Мясніковічу прапрацаваць гэтае пытанне з кожным з бакоў і давесці да іх абмеркаваныя пазіцыі. У выпадку згоды кіраўнікоў дзяржаў Беларусь прапануе правесці сустрэчу ў выключна вузкім складзе, гарантаваўшы поўную бяспеку кожнаму з членаў дэлегацый. Альтэрнатыўным варыянтам правядзення гэтага абмеркавання, на думку беларускага боку, можа стаць відэаканферэнцыя з удзелам лідараў Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Варвара МАРОЗАВА.**

**Да ведама членаў Савета рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**2 красавіка 2020 года ў 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

# Практычна ўсе айчынныя спартсмены вярнуліся ў Беларусь

**Пра гэта расказаў прэс-сакратар Міністэрства спорту і турызму Уладзімір Несцяровіч. Яшчэ тыдзень таму на зборах у розных кутках планеты знаходзілася каля 100 беларускіх атлетаў.**

30 сакавіка з Расіі вярнуліся 16 лёгкаатлетаў, 31-га — яшчэ 13, пасля чаго за межамі Беларусі засталіся толькі сем спартсменаў. Шэсць з іх знаходзяцца ў планавым адпачынку на тэрыторыі Расіі, адзін праходзіць навучанне ў ЗША.

Усе, хто прыбывае з-за мяжы, праходзяць праверку на наяўнасць каранавіруса, пасля чаго адпраўляюцца на двухтыднёвы каранцін. На цяперашні момант, па словах прадстаўніка Міністэрства спорту і турызму, вызначаны чатыры базы, дзе прадугледжаны санітарна-эпідэмічны рэжым, медыцынская рэабілітацыя і назіранне за спартыўнымі дэлегацыямі. Выезды за мяжу на вучэбна-трэніровачныя зборы і спаборніцтвы часова забароненыя. Зараз у Беларусі для спартсменаў створаны ўсе неабходныя ўмовы для якаснага трэніровачнага працэсу, таму праблем з падрыхтоўкай да спаборніцтваў няма. Спартыўная інфраструктура дазваляе праводзіць паўнавартасныя заняткі.

Адзначым: на сённяшні дзень 72 беларускія атлеты, якія прадстаўляюць 15 відаў спорту, выканалі кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматывы, якія даюць права выступаць на Алімпіядзе ў Токіа. Пакуль адборачныя турніры да Гульняў прыпыненыя ў сувязі з распаўсюджаннем COVID-19, а пасля іх аднаўлення беларусы маюць намер заваяваць яшчэ некалькі дзясяткаў алімпійскіх квот.

**• Тым часам**

Экс-першая ракетка свету, трохразовы пераможца Кубка свету, шасціразовы чэмпіён Еўропы ў розных разрадах па настольным тэнісе Уладзімір Самсонаў пералічыў 10 000 еўра на дабрачынны рахунак для дапамогі беларускім медустановам у барацьбе з каранавірусам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Навуковая дапамога аграрыям

**Найважнейшы фактар, які аказвае ўплыў на фарміраванне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, — гэта прымяненне комплексных мінеральных угнаенняў. Айчынныя навукоўцы распрацавалі 84 новыя іх формы для эфектыўнага правядзення пасяўной. Пра гэта расказаў дырэктар Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі Віталь ЛАПА.**

— Каля 70 працэнтаў ад усяго аб'ёму ўгнаенняў у свеце выкарыстоўваецца ў выглядзе комплексных, таму можна сказаць, што гэта сусветны трэнд. Наш інстытут распрацаваў новыя іх віды практычна для ўсіх культур, якія вырошчваюцца ў краіне. Яны збалансаваныя па змесце асноўных макра- і мікраэлементаў. Гэтыя комплексныя ўгнаенні вырабляе ў краіне Гомельскі хімічны завод. Усяго іх там выпушчана 466 тысяч тон — гэта добры аб'ём, але ўсё яшчэ недастатковы для ўсёй сельскай гаспадаркі.

Дарэчы, як адзначыў Віталь Лапа, беларуская прадукцыя запатрабавана і за мяжой. Больш за дзесяць краін купляе іх у гомельскага прадпрыемства.

Вучонымі навукова-практычнага цэнтра НАН па механізацыі сельскай гаспадаркі для пасяўной распрацавана і новае машыннае абсталяванне. «Гэта агрэгаты для ранняй культывацыі, якія дазваляюць захаваць у глебе вільгаць, што для цяперашняй вясны вельмі актуальна. Да таго ж створаны машыны для апрацоўкі глебы і пасеваў — камбінаваныя, з шырынёй захопу шэсць і дзевяць метраў. Яны заснаваны на модульным прынцыпе, калі такі агрэгат можа камплектавацца рознымі тыпамі рабочых органаў у залежнасці ад аграфону», — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Мікалай БАКАЧ.**

Ён дадаў, што для эфектыўнага правядзення пасяўной навукоўцы штогод ствараюць розныя распрацоўкі, якія паспяхова ўкараняюцца ў вытворчасць, і што, немалаважна, яны не горшыя за імпартныя аналагі. Напрыклад, ужо завершана работа па стварэнні дванаццацікорпуснага абаротнага плуга. Эксплуатуюцца аграрыямі краіны і высокапрадукцыйныя глебаапрацоўчыя агрэгаты з шырынёй захопу дванаццаць метраў, якія разам з пасевам могуць уносіць стартавую дозу мінеральных угнаенняў. Новыя машыны дазваляюць кантраляваць работу анлайн і адносяцца да дакладнага земляробства.

Анамальна цёплая зіма ўнесла карэктывы ў правядзенне падкормкі азімых рапсу і збожжавых. Сёлета, паводле маніторынгу навукова-практычнага цэнтра па земляробстве, не было рэзкіх перападаў тэмператур, таму расліны выйшлі з зімоўкі ў добрым стане. Пра гэта расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН па земляробстве Эрома УРБАН:**

— Тактыку правядзення веснавых палявых работ вызначылі пачатак вегетацыі, наяўнасць прадукцыйнай вільгаці ў глебе, магчымасць выхаду тэхнікі на палі. Асаблівасць сёлетняй пасяўной заключаецца ў тым, што многія этапы праходзяць амаль адначасова ва ўсіх абласцях краіны. Калі ў папярэднія гады паўночныя пачыналі ўносіць падкормку праз дзесяць—дванаццаць дзён пасля таго, як гэта зрабілі на поўдні, то гэтай вясной надвор'е дазволіла змяніць падыход.

Эрома Урбан нагадаў, што сёлета зрушацца тэрміны і другой азотнай падкормкі, якая раней прыпадала на канец красавіка. Гаспадаркі, якія ўжо завяршылі першую, хутка могуць выйсці на «другі круг».

Цёплая зіма таксама паўплывала і на інтэнсіўнасць, у параўнанні з папярэднімі гадамі, развіцця хвароб на азімых збожжавых культурах. Гэта падкрэсліў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута аховы раслін НАН Беларусі Аляксандр ЖУКОЎСКІ.**

> **«Для эфектыўнага правядзення пасяўной навукоўцы штогод ствараюць розныя распрацоўкі, якія паспяхова ўкараняюцца ў вытворчасць, і што, немалаважна, яны не горшыя за імпартныя аналагі».**

— Хваробы сельскагаспадарчых раслін, у прыватнасці рапсавы і капусны скрытнахобатнік, сёлета — праблема для аграрыяў краіны. Захавалася таксама вялікая інтэнсіўнасць мучністай расы, септарыёзу, на жыце сустракаюцца іржа і жоўтая плямістасць. Апошнія дзве хваробы нехарактэрныя для нашых умоў. Таму трэба прадугледзець фунгіцыдныя апрацоўкі. Іх можна выкарыстоўваць пры тэмпературы паветра да плюс васьмі градусаў, калі яна захоўваецца на працягу чатырох—пяці сутак. У такіх умовах расліны цалкам аднаўляюць вегетацыю, і прэпарат будзе эфектыўна працаваць.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

**Лепельскі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў выказваюць шчырыя спачуванні Мартынаву Ігару Феліксавічу, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Лепельскай выбарчай акрузе № 23, у сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Мартынаву Ігару Феліксавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и права частной собственности на земельный участок для обслуживания не завершенного строительством жилого дома в г. Гродно (микрорайон «Погораны-Кошевники») 5 мая 2020 года

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе начальная цена не завершенного строительством капитального строения), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Дружная, д. 4 (У-536 микрорайон «Погораны-Кошевники»)** | 440100000003004091 | 0,1223 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность 5 % | 81,0 | 20 131,53 (1 296,47) | 4 000,00 |

** Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, канализации, электроснабжения. Точки подключения определяются проектом. Земельный участок имеет ограничения.*

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

- внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 5 мая 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

- заявление на участие в аукционе установленной формы;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
- подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 6 апреля по 29 апреля 2020 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

- внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by, gcn.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 5 мая 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок У-326* | ул. Аркадия Кулешова, микрорайон «Заболоть» | 0,1035 | 440100000002010144 | 3 148,74 | 17 745,40 | 3 400 |

** Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.*

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

- внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 5 мая 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования. Дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет 407 с 6 апреля по 29 апреля 2020 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

- внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: +375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальные сайты организатора торгов www.grodno.gov.by, gcn.by**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Добрая навіна

# КОЛЬКАСЦЬ «СУПРАЦЬПРЫШЧЭПАЧНІКАЎ» ЗМЯНШАЕЦЦА,

## бо вакцыны даказваюць сваю эфектыўнасць

**СУСВЕТНЫ тыдзень імунізацыі сёлета пройдзе з 24 да 30 красавіка пад лозунгам #Vaccines Work for AN# — «За агульны доступ да эфектыўных вакцын». Урач-педыятр, загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ расказала, чаму імунізацыя дагэтуль застаецца самай паспяховай мерай аховы здароўя, якая выратоўвае мільёны жыццяў.**

— Як вядома, хваробу лягчэй прадухіліць, чым лячыць, і гэта аксіёма. Але ў наша «прасунутае» стагоддзе знаходзяцца людзі, якія скептычна ставяцца да імунізацыі. Пра гэта сведчыць і пэўная колькасць бацькоў, якія адмаўляюцца ад правядзення прафілактычных прышчэпак сваім дзецям. Інакш як дрэннай інфармаванасцю, а таксама бесклапотнасцю гэта растлумачыць немагчыма, — кажа Людміла Іванаўна. — Бо імунізацыя дае кожнаму дзіцяці шанц на здаровае жыццё з першых дзён да сталага веку.

У нашай краіне, як і ў многіх іншых, планавая імунізацыя праводзіцца згодна з Нацыянальным календаром прафілактычных прышчэпак (апошняя рэдакцыя — пастанова Міністэрства аховы здароўя ад 17.05.2018 г. № 42 «Аб прафілактычных прышчэпках»). У яго ўключана вакцынацыя ад асноўных інфекцыйных хвароб, якія з'яўляюцца найбольш небяспечнымі для чалавека.

— Калі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя дзеці паміралі ці становіліся інвалідамі пасля перанесенага поліяміэліту, то ў цяперашні час у нашай краіне дзякуючы імунізацыі рэгіструюцца адзінкавыя завозныя выпадкі гэтай інфекцыі.



А такія грозныя хваробы, як слупняк і дыфтэрыя, апошнія гады ўвогуле ў нас не сустракаюцца, — нагадвае ўрач-педыятр. — Дзякуючы імунізацыі рэзка скарацілася захваральнасць на гепатыты А і В.

Людміла Кіпцэвіч кажа, што было б выдатна, калі б з'явіліся вакцыны супраць ВІЧ і гепатыту С — яны сталі б заменай доўгай тэрапіі і змаглі б абараніць чалавека ад гэтых смяротна небяспечных захворванняў. Аднак у сувязі з высокай мутацыяй (зменлівасцю) гэтых вірусаў прафілактычных прышчэпак ад іх пакуль няма.

— Сёння ўжо не стаіць пытанне, ці варта прышчапляцца ад адру, бо усё расставіла на месцы нядаўняя эпідэмія гэтай інфекцыі ў Еўропе і бліжнім замежжы, у прыватнасці ва Украіне, — кажа ўрач.

Нагадаем, што на адзёр у 2018 годзе па ўсім свеце захварэла 353 тысячы чалавек, а ў 2019-м — 429 тысяч. У нашай краіне захварэў усяго 201 чалавек, і медыкі тлумачаць такую лічбу высокім ахопам прышчэпкамі супраць адру. Для дзіцячага насельніцтва ён складае 97 %.

— Нават такія інфекцыі, як краснуха і эпідэмічны паратыт, якія не заўсёды працякаюць цяжка, могуць прыводзіць да цяжкіх незваротных наступстваў. Пры захворванні на краснуху цяжарнай жанчыны вельмі высокая рызыка выродлівасці ці мёртванараджання плоду. А хлопчык, які перанёс эпідэмічны паратыт, можа назаўсёды застацца бясплодны, — звяртае ўвагу Людміла Кіпцэвіч.

Цяпер бацькі могуць прышчапіць сваіх дзяцей ад асноўных узбуджальнікаў, якія выклікаюць пнеўманію, а таксама супраць такой небяспечнай інфекцыі, як менінгакокавы менінгіт.

З 2012 года ў Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак уключана вакцынацыя супраць грыпу, які адносіцца да найбольш распаўсюджаных і небяспечных сваімі ўскладненнямі інфекцый. У нас у краіне зарэгістраваны і прысутнічае ў аптэчнай сетцы толькі адзін прэпарат для лячэння яго цяжкіх формаў — асельтамівір. Прычым прымаць яго варта не пазней чым праз 72 гадзіны ад пачатку хваробы, а яшчэ лепш — у першыя суткі. Далей яго эфектыўнасць зніжаецца. А ўскладненні грыпу часам выклікаюць нават смерць — дастаткова згадаць пандэмію грыпу 2009 года.

— З той пары, дарэчы, прыхільнікаў вакцынацыі супраць грыпу з кожным годам становіцца больш. У дзіцячых калектывах — школах і садках — колькасць прышчэпленых цяпер дасягае 50—60 %. Эфектыўнасць вакцынацыі складана пераацаніць: амаль усе выпадкі захворванняў на грып у апошнія гады — у непрышчэпленых, і толькі ў іх развіваюцца постгрыпозныя ўскладненні, — прыводзіць звесткі Людміла Кіпцэвіч. — Таму калі мы хочам, каб нашы дзеці раслі ў бяспецы і былі здаровыя, парада адна — прышчапляцца.

Гіпотэза

# Прышчэпка БЦЖ замаруджвае распаўсюджванне COVID-19?

**Адна з прышчэпак, якая ўваходзіць у Нацыянальны каляндар, можа змяншаць імавернасць заражэння COVID-19. Такія звесткі, як паведамляе ТАСС, апублікавалі амерыканскія эпідэміёлагі. Вучоныя звязваюць розніцу ў хуткасці распаўсюджання і ўзроўні смяротнасці ад каранавіруса ў розных краінах з тым, як даўно і наколькі шырока ў іх выкарыстоўваецца вакцына БЦЖ, якая прызначана для барацьбы з туберкулёзам.**

«Жыхары тых краін, у якіх універсальная вакцынацыя з дапамогай БЦЖ не была прынята, у тым ліку Італіі, Нідэрландаў і ЗША, мацней за ўсё церпяць ад COVID-19. Акрамя таго, мы выявілі, што вакцынацыя БЦЖ зменшыла колькасць выпадкаў заражэння вірусам. Камбінацыя паніжанай смяротнасці і захваральнасці можа зрабіць гэту прышчэпку адным з галоўных інструментаў у барацьбе супраць віруса», — пішуць вучоныя.

Вакцыну БЦЖ распрацавалі ў 1921 годзе французскія бактэрыёлагі Альбер Кальмет і Каміль Герэн. Яна дагэтуль застаецца галоўным сродкам барацьбы супраць туберкулёзу. Пры гэтым многія вучоныя сумняваюцца ў яе эфектыўнасці, асабліва для вакцынацыі дарослага насельніцтва. Таму, у адрозненне ад Расіі і іншых краін былога СССР, вакцыназанне БЦЖ у ЗША і некаторых краінах Еўропы ў масавым парадку не праводзілі.

Вучоныя вырашылі высветліць, наколькі БЦЖ можа ўплываць на распаўсюджванне каранавіруса і імавернасць гібелі ад яго. У цэлым хуткасць распаўсюджвання і смяротнасць ад SARS-CoV-2 залежалі ад эканамічных паказчыкаў, аднак для невялікай групы краін, у тым ліку ЗША, Ірана, Італіі, Бельгіі, Нідэрландаў і шэрагу іншых еўрапейскіх дзяржаў, гэта было не так. Гэтыя краіны аб'ядноўвала тое, што ў іх ніколі масава не прымянялі вакцыну БЦЖ ці яе пачалі выкарыстоўваць адносна нядаўна. У выніку, як пішуць вучоныя, адносная колькасць выпадкаў заражэння ў такіх краінах аказалася ў чатыры разы вышэйшая за тыповыя значэнні для ўсёй планеты ў цэлым, што было характэрна і для ўзроўню смяротнасці.

На карысць гэтага сведчыць і наступны факт: у краінах, дзе названыя прышчэпкі робяць пастаянна ўсяму насельніцтву, пачынаючы з пачатку мінулага стагоддзя, у прыватнасці ў Бразіліі, назіраецца незвычайна нізкі ўзровень смяротнасці ад каранавіруснай інфекцыі, несупастаўляльны са станам іх эканомікі. На думку даследчыкаў, гэта сведчыць аб тым, што БЦЖ можа сапраўды абараніць арганізм ад каранавіруса новага тыпу.

У Беларусі вакцынацыя супраць туберкулёзу таксама праводзіцца — на 3—5-я суткі пасля нараджэння. У будучым на месцы ўколу — у верхняй траціне левага пляча — можа сфарміравацца круглы келоідны рубец.

# БОЛЬШ САДАВІНЫ І АГАРОДНІНЫ, СПЕЦЫЙ І КРУП

## Як харчавацца, каб вясной не захварэць?

**Увесну, калі актыўнасць нашай імуннай сістэмы зніжана з-за працяглай барацьбы з вірусамі, адсутнасці неабходнай колькасці вітамінаў і сонечных дзён, лёгка захварэць. Тут варта ўспомніць аб правільным, рацыянальным харчаванні, якое дае магчымасць падтрымаць і ўмацаваць сваё здароўе і павысіць ахоўныя сілы арганізма.**



З ежай мы павінны атрымліваць дастатковую колькасць бялкоў, тлушчаў і вугляводаў — у суадносінах 1:1:4, важныя мінеральныя рэчывы (макра- і мікраэлементы), комплекс вітамінаў і, вядома ж, ваду. А рацыянальны рэжым харчавання прадугледжвае 4-5-разовы прыём ежы на працягу сутак з інтэрвалам 3-4 гадзіны і вячэру не пазней, чым за 2-3 гадзіны да сну. Сняданак павінен складаць каля 25 % сутачнага рацыёну, абед — 35 %, падвячорак — каля 15 %, а вячэра — астатнія 25 %. Важна, каб харчаванне было энергетычна адэкватнае — колькі атрымалі, столькі і патрацілі.

— У штодзённы рацыён трэба ўключаць агародніну і садавіну, асабліва тую, што ўтрымлівае вітаміны A, B1, C, E, свежую зеляніну, багатую на вітаміны групы B, — кажа **ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга ФІНСКАЯ.** — Як вядома, да пачатку вясны ў агародніне і садавіне, сабраных восенню, як і ў замарожаных, вітамінаў значна менш, аднак яны багатыя на клятчатку, якая дапамагае рабоце кішэчніка, у тым ліку ачышчэнню арганізма ад таксінаў. Таму карысць ад іх прыёму абавязкова будзе. Варта згадаць і пра такую агародніну, як капуста, морква, буракі, цыбуля, якія да вясны не трацяць сваіх карысных уласцівасцяў.

Для падтрымання імунітэту і ахоўных функцый арганізма нам патрэбны крупы, арэхі і сухафрукты — яны ўтрымліваюць неабходныя вітаміны групы B і вітамін E, жалеза, селен, цынк.

— Паколькі арганізм не можа назапасіць пажыўныя рэчывы на працяглы час, іх паступленне павінна быць рэгулярнае і штодзённае, — нагадвае ўрач.

У рацыён абавязкова варта ўключыць паўнавартасны бялок (а гэта мяса і тварог), які з'яўляецца будаўнічым матэрыялам нашага арганізма і ўдзельнічае ў сінтэзе імунаглабулінаў. Акрамя таго, для работы імуннай сістэмы патрэбныя і тлушчы, бо гэта не толькі крыніца энергіі, але і будаўнічы матэрыял для клетак. Стравы з мяса і рыбы ўтрымліваюць вялікую колькасць незаменных амінакіслот, вітамінаў і мікраэлементаў, а таксама энзімы, якія актывізуюць стрававание. Нельга выключаць з рацыёну яйкі і малочныя прадукты, — рэкамендуе суразмоўца.

Спрыяльна на сістэму стрававання і імунітэт уплываюць спецыі, асабліва імбір, каляндра, кардамон і кумін.

— Што датычыцца спосабу гатавання, то больш карысная будзе адварная, тушаная і запечаная ежа, а ад смажанай і вэнджанай лепш адмовіцца. Мінімальна неабходная тэрмічная апрацоўка дазволіць захаваць максімум карысных рэчываў, — кажа Вольга Фінская.

Не менш важна ўжываць дастатковую колькасць вадкасці. Лепш за ўсё, калі гэта будзе чыстая негазіраваная вада. Яна дапамагае рабоце кішэчніка, забяспечвае дэтаксікацыю арганізма. Надаюць сіл, аднаўляюць бадзёрасць і забяспечваюць вітамінамі свежавыціснутыя сокі з агародніны і садавіны, а таксама морсы і кампоты з замарожаных ягад.

— Правільнае харчаванне з'яўляецца прафілактыкай розных неінфекцыйных хвароб: стрававальнай сістэмы (гастрыты, язвы, панкрэатыт), сардэчна-сасудзістай сістэмы, гіпертаніі, дыябету, парушэнняў абмену рэчываў, атлусцення. Акрамя таго, яно спрые захаванню прыгажосці, запавольвае працэсы старэння арганізма, а таксама дапамагае падтрымліваць на належным узроўні актыўнасць імуннай сістэмы, — рэзюмуе ўрач.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Чалавек — чалавеку

# Сярод добрых людзей

**...Бацьку гэтага дзіцяці лёс не шкадаваў. Трое яго малых загінулі ў час вайны ад рук фашыстаў, не пашчасціла і чацвёртай: трохмесячная дачка, пасля таго як памерла маці, апынулася ў доме малюткі.**

Грэх было скардзіцца: дзяўчынку і кармілі там, і абмывалі, і нянек як быццам хапала. «Дагледжанае дзіця, — штораз казаў бацька, наведаўшы малую. — А якое ж разумнае! Усё чуе, усё разумее, праўда, не гаворыць...»

З гэтым болем і клопатам ён неяк жыў, працаваў, пераехаў у вёску Падгай Мінскага раёна, з часам сустрэў жанчыну. У гэтай яго новай сям'і нарадзіўся хлопчык. І тады... «До табе рваць душу, — сказала жонка. — Дзе адно дзіця, там і двое. Едзь — забірай дачушку. Будзем самі гадаваць».

Вось так Галя апынулася ў новым месцы, у клапатлівай сям'і. «Харошае дзіцятка, — прызнавалі вяскоўцы, — але ж чаму не гаворыць? Ці хрышчонае яно?» — «Не», — мусілі прызнацца бацькі ды павялі дзіця ў царкву. А пасля гэта проста дзіву даліся: адкуль толькі што ўзялося?! Дзяўчынка пачала не проста гаварыць, а нават лапатаць, нібы выплюхваць з сябе ўсё слоўнае багацце, якое назапасіла за свае чатыры гадкі...

У маленстве яна вельмі любіла жывёл, медыцыну, магла пайсці ў ветэрынары, аднак лёс распарадзіўся іначай: стала тэхнолагам, працавала ў ліцейным цэху, паралельна (няхай будзе, за плячыма насіць не трэба) — скончыла курсы кройкі і шыцця. І тады ж, разам з іншымі «гарадскімі», трапіла на так званыя сельгасработы ў калгас «Саюз» Бярэзінскага раёна, запала ў душу мясцоваму хлопцу, неўзабаве стала жонкай...

Муж, Мікалай Ліхадзіеўскі, працаваў кіроўцам сельгастэхнікі, сама ўладкавалася швачкай на мясцовую фабрыку і адразу ж паказала сябе з найлепшага боку: арганізавала хор, стала старшынёй прафкама, атрымала жыллё — палову няхай недабудаванага, але ж дома, — у якім з часам загучалі галасы дзяцей...

Потым былі гады перабудовы. Іх швейная фабрыка, не вытрымаўшы канкурэнцыі, спыніла сваю работу, кадры паразыходзіліся хто куды. Галіна Пятроўна ўладкавалася на раённы вузел электрасувязі, дапрацавала да пенсіі. Але, як той казаў, не ўгаманілася: па-ранейшаму арганізоўвае паездкі па музеях і тэатрах, адстойвае інтарэсы людзей. Каб захаваць краму на вуліцы Мультана, схадзіла на прыём да старшыні райвыканкама, каб навесці парадак у кавярні, звярнулася да камунальнікаў, каб абсталяваць прыпынак — да кіраўнікоў дарожных службаў... Гэта — клопат пра жывых. Сярод абавязкаў — і апошні шлях памерлых...

Такое вось неспакойнае жыццё ў ветэрана, поўнае любові да людзей, сярод якіх некалі расла, сярод якіх жыве.

**Ніна Бурко,** *Бярэзінскі раён.*

Была вайна

# «Не жаночая гэта справа — хадзіць з вінтоўкай...»

Колькі часу мінула, але ветэраны да сёння памятаюць пажары, свіст куль, разрывы бомбаў, траскучыя маразы і вогнішчы каля партызанскіх зямлянак... Праўда, сведак гэтых падзей усё менш і менш. У нашай вёсцы, напрыклад, толькі адна — Ніна Рыгораўна Барысевіч.

Нарадзілася яна ў шматдзетнай працавітай сям'і ў вёсцы Загалле. Бацька яе быў умелым шаўцом, маці пыніла гаспадарку. Сваёй уласнай зямлі сям'я не мела, а таму больш-менш спакойнае жыццё скончылася, як толькі памёр гаспадар... Ніне на той час было пяць гадоў, і яе сталі гадаваць бабуля з дзедам. Ад іх Ніна хадзіла ў пачатковую школу, потым у васьмігодку, якую скончыла перад самай вайной.

Дзень 22 чэрвеня 1941-га жанчына памятае нібы ўчарашні, бо якраз у тую нядзельку ў Загаллі было вяселле, на якім гулялі амаль усе вяскоўцы і амаль усю тую кароткую ноч. А раніцай наваколле скаланула страшная вестка — вайна!

З пачатку яе ў Загаллі была сфарміравана партызанская група, у склад якой увайшла і Ніна. Разам з сябрамі яна збірала інфармацыю пра немцаў і здраднікаў, пра іх узбраенне. Для гэтага часам бегалі ажно ў Слаўкавічы. Нацярпеліся страху: аднойчы іх злавіў паліцай і замкнуў у чужым халодным склепе...

Да таго ж хлопцы распаўсюджвалі лістоўкі, дзяўчаты вязалі шкарпэткі і рукавіцы з двума «пальцамі», каб у іх зручней было трымаць зброю.

Паступова вёска Загалле станавілася моцнай партызанскай базай, аднак жыццё там спакойным не было: немцы бамбілі часта. А неяк уварваліся ў вёску, сталі паліць хаты, а жыхароў зганяць у хлеў... Запаліць яго не паспелі. Прыехаў нейкі афіцэр і загадаў выпусціць людзей, бо партызан, маўляў, паблізу няма. Моладзі хацелася даказаць, што ёсць. У Загаллі і Жывуні былі створаны камсамольскія падпольныя арганізацыі.



З вясны 1942 года над мясцовасцю сталі з'яўляцца нашы самалёты. Яны скідвалі зброю, боепрыпасы, газеты і лістоўкі. Каб прымаць іх, трэба было мець свой аэрадром. Рыхтаваць пляцоўку пад яго, карчаваць лес, засыпаць ямы стала моладзь. І ўжо ў верасні 1942 года самалёты маглі садзіцца на востраве Зыслаў. Там жа знаходзіліся Мінскі абкам партыі, камандаванне партызанскага злучэння, выходзілі газеты «Звязда», «Чырвоная змена». У Загаллі працавала партызанская школа, у якой настаўнічалі камсамолкі Марыя Дзяшковіч, Аляксандра Бедзік, Антаніна Корбут і Аляксандра Комлік.

...Позняй восенню ў Загалле прыехалі партызаны з Рэдкавіч. Адзін з іх, Адам, прыглянуўся Ніне. Неяк, выконваючы баявое заданне, яны разам з іншымі натрапілі на варожую засаду, завязаўся бой, пасля якога хлопец сказаў: «Не жаночая гэта справа — хадзіць з вінтоўкай і ў цяжкіх салдацкіх ботах. Жанчына павінна гадаваць дзяцей».

Запярэчыць тады Ніна не магла, бо яе калаціла гарачка. Адам прывёз доктара, той паставіў дыягназ — тыф.

Выжыць ёй удалося цудам... І ці не гэта хвароба, хісткасць жыцця паскорыла намеры маладых пабрацца шлюбам. Вяселле спраўлялі ў глухім загальскім лесе.

— А музыка ж ці была? — спытала я жанчыну.

— А як жа! І музыка, і песні, і ваўкі, — засмяялася яна.

Пасля вяселля Адам прапанаваў жонцы паехаць у Рэдкавічы. Так яны апынуліся ў атрадзе імя А. Труцікава, дзе камандзірам быў Васіль Статкевіч. Жонку яго звалі Марыяй. Часам жанчыны таксама хадзілі на баявыя заданні нароўні з мужчынамі. Аднак асноўным заняткам у Ніны быў догляд хворых і параненых. Марыя гатавала ежу.

Партызанскі атрад стаяў у лясным масіве «Смалянка». Ніне Рыгораўне ў памяці, як двое байцоў захварэлі на тыф. Адзін з іх вельмі прасіў журавін. Адам не пускаў жонку па ягады — кругом былі немцы ды паліцаі. Але Ніна ўпершыню не паслухала яго: раніцай употай выбегла з зямлянкі, дабралася да балота і назбірала журавін. Пацыент пасля папраўкі расказваў усім, што ўратавалі яго менавіта ягады.

...Шмат што давялося перажыць. Ніна Рыгораўна ніколі не забудзе, як у атрад прывезлі раненага разведчыка Івана. Хлопец згасаў на вачах: нага пачарнела і распухла, пачыналася гангрэна. «Будзем рэзаць... Звычайнай пілой, — сказаў Ніне доктар. — Іншага інструмента ў нас няма, а марудзіць нельга».

Каб хоць трохі прытупіць боль, раненаму далі гарэлкі, і разведчык той вытрымаў — перанёс цяжкую аперацыю.

...Наш Любанскі раён быў вызвалены 30 чэрвеня, а неўзабаве свабодная стала і ўся Беларусь. У Мінску пасля мітынгу адбыўся парад Перамогі, у якім удзельнічаў і Адам Барысевіч.

А далей пачаліся будні: хата яго (як, дарэчы, амаль усе ў вёсцы Рэдкавічы) была спалена — давялося ўзвесці новую, лепшую. У ёй нарадзілася пяцёра дзяцей, у ёй без малога шэсцьдзясят гадоў сужэнцы пражылі разам.

І ніколі не маглі змірыцца з тым, колькі людзей — маладых, прыгожых — у гады вайны палягло, колькі пакут перанесена.

**Марыя СЛІВЕЦ, бібліятэкар,**
*Любанскі раён.*

***P.S.** На вялікі жаль, пусцеюць вясковыя хаты. Не дажыла да гэтага дня Перамогі і Ніна Рыгораўна: абарваўся яе жыццёвы шлях. Але землякі будуць помніць яе, як і юныя ўдзельнікі дзіцячага аматарскага аб'яднання «Сіняя зорка», якія (на здымку) часта слухалі яе ўспаміны.*

Напярэдадні

# КАБ ПАРАДАВАЦЬ БЛІЗКІХ...

**Вялікдзень — найвялікшае свята, і рыхтавацца да яго трэба загадзя. Многія, відаць, купілі ўжо фарбавальнікі для яек, іх шмат цяпер у продажы, аднак я лічу, што найлепшыя — усё ж натуральныя, створаныя самой прыродай. А спосабаў афарбоўкі шмат. Што варта ведаць?**

Каб у час варкі яйкі не патрэскаліся, трэба дастаць іх з халадзільніка і на некалькі гадзін пакінуць у цяпле. Перад фарбаваннем старанна вымыць з мылам ці содай (абястлушчыць), працерці ваткай, змочанай у воцаце або ў лімонным соку.

Раствор для фарбавання я раблю загадзя. Кладу, напрыклад, шмат цыбульнага шалупіння, заліваю вадой, вару хвілін 30, цягам сутак даю настаяцца і працэджваю. Затым даводжу да кіпення, сыплю сталовую лыжку солі, апускаю яйкі і, паварыўшы хвілін 10—15, вымаю — ужо чырвоныя.

Для атрымання іншых адценняў гэтага колеру выкарыстоўваю бурачны адвар, кару вішні. Кара дуба робіць яйкі «бронзавымі», адвар маладой зеляніны азімых, крапівы, лістоў бярозы — зялёнымі, адвар морквы — жоўтымі.

Можна, прыкласці да яйка лісточкі дрэў, пятрушкі, папараці, крапівы, шчыльна абвязаць марляй... Можна мокрыя яйкі абкачаць у сухім рысе (ці ў іншых крупах), загарнуць у кавалачкі капронавых калгот і гатаваць у цыбульным шалупінні. Атрымліваюцца сімпатычныя крапінкі.

Пафарбаваныя яйкі я вельмі люблю размалёўваць акварэльнымі фарбамі тонкім пэндзлем або зубачысткай. Узоры могуць быць самыя розныя: крыжыкі, кружочкі, смайлікі, кветачкі, сонейкі. Яйкі атрымліваюцца вельмі незвычайныя. Такія прыемна падарыць блізкім.

**Соф'я Кабарыха,**
*в. Паланечка, Баранавіцкі раён.*

Смех смехам...

# Найлепшы будзільнік

У вёсках шмат хто мае мянушкі. Майго дзеда звалі, напрыклад, Цвік (бо худы і роўненькі), яго сябрукоў-суседзяў — Мангол (за вузкія вочы, відаць) і Зэдаль (за прысадзістасць).

Дык вось аднойчы гэтая тройца з'ездзіла на кані на базар, усё, што трэба, купіла, а дарогай дамоў завітала да Манголавай (Толікавай) сваячкі — да цёткі Марысі. Тая і накарміла іх блінамі ды капустай, і напаіла вішнёвай наліўкай... Пасля такога пачастунка Зэдаль аж заснуў за сталом.

— І што гэта нам рабіць? — трохі пазней спытаў дзядуля Толіка. — Мы дамоў дабяромся. А Зэдаль як? Не даедзе ж?

— А навошта ж вам яго браць? — не зразумела гаспадыня. — Ён у гэтай хаце сто гадоў каля печы стаіць. Ніколі нікуды не ездзіў!

Госці з гэтых слоў так рагаталі, што Зэдаль... прачнуўся, устаў і на сваіх дваіх дайшоў да воза.

**Таццяна Марцэвіч,** *аг. Ёдкі, Лідскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Спецыяльны рэпартаж

# ПРАВЕРКІ НА ДАРОГАХ

Карэспандэнты «Звязды» выправіліся ў рэйд з супрацоўнікамі ДАІ







**Абстаноўка на дарогах Мінскага раёна — не з самых простых. Пацвярджае гэта і статыстыка — з пачатку года ў прысталіччы зарэгістравана 21 дарожна-транспартнае здарэнне супраць васьмі за мінулы год. Тры чалавекі загінулі, яшчэ 23 атрымалі раненні.**

**Хоць шчыльнасць — як насельніцтва, так і аўтамабільнай плыні — тут куды меншая, чым непасрэдна ў Мінску, але на шырокіх магістралях і вузкіх вясковых вуліцах ад гэтага цішэй не становіцца. Не ў апошнюю чаргу — праз наяўнасць транзітных калідораў і блізкасць самой сталіцы. Таму «Звязда» адправілася разам з інспектарамі дарожна-патрульнай службы аддзела ДАІ Мінскага райвыканкама на маніторынг сітуацыі на прысталічных дарогах.**



Першы выезд у пятніцу ўвечары для нас аказаўся незвычайны. Кіроўца легкавіка заехаў па дарозе ў вясковую краму. А калі выязджаў — наехаў бамперам на плот. Прыкмячаем, што ад вадзіцеля крыху патыхае алкаголем. Па словах мужчыны, ён прыехаў дадому і з гора выпіў трохі спіртнога. А недзе праз паўгадзіны каля дома спынілася машына ДАІ. Разгублены Валерый сваю віну прызнае і зусім не адпіраецца. Яго адвезлі ў раённую наркалогію на асведчанне. А па факце тое, што адбылося, — гэта з'езд з месца ДТЗ, здзейсненага ў нецвярозым стане, а таксама ўжыванне спіртных напояў пасля аварыі. Як вынік — пазбаўленне правоў на тры гады.

— Сын падняў пралёт плота, — кажа гаспадыня крамы. — Прапанавалі выклікаць ДАІ і аформіць ДТЗ, але завёў матор і з'ехаў. Пашкоджанні былі і на бакавых дзвярах аўтамабіля. А наогул, тут раней гэты плот зносілі, можна сказаць, рэгулярна.

...Другі раз мы адпраўляемся раніцай у чацвер. Спачатку праязджаем некалькі кіламетраў па поўдні Мінскага раёна адразу за МКАД-2. За вокнамі патрульнага аўтамабіля адна за адной змяняюцца назвы вёсак на дарожных паказальніках — Крупіца, Анопаль, Кругляк... Каля вёскі Кайкава прыходзіць інфармацыя. Паведамляюць пра тое, што здарылася ДТЗ — фура з'ехала ў кювет каля вёскі Слабодка на 18-м кіламетры дарогі Р1. Шлях туды займае хвілін 15-20. За гэты час паспяваем распытаць міліцыянераў пра асаблівасці іх службы.

— За дзень мы ў сярэднім праязджаем па дарогах 150-160 кіламетраў, — расказвае **старшы лейтэнант міліцыі Дзмітрый ПЫКО.** — І падчас патруляванняў сустракалі ўсе парушэнні, якія толькі могуць быць. Ад непрышпіленага рэменя бяспекі — і да кіравання ў нецвярозым стане. У цёмны час сутак тут шмат людзей ходзіць без святлоадбівальных элементаў... Але ж вясковая вуліца — не гарадская, тут тратуары ёсць далёка не заўсёды. Былі выпадкі, калі нецвярозыя пешаходы ішлі па цэнтры дарогі, падалі проста пад колы аўтамабіляў... Ну нават калі перабраў, то навошта рызыкаваць жыццём? Выклікай таксі і едзь дадому. Не праблема ж. Сярод моладзі мы не раз сустракалі тых, хто любіць на матацыкле паганяць на заднім коле, падрыфтаваць на аўтамабілі...

— За першыя дзве з паловай гадзіны нашай змены прыйшло адно паведамленне. Нейкі аўтамабіль стаяў тры дні з пашкоджаннямі, характэрнымі для дарожна-транспартнага здарэння. Прыехалі туды — інфармацыя пацвердзілася. У салоне аўтамабіля ляжала даведка пра тое, што ўладальнік з'яўляецца пацярпелым. Сазваніліся з жанчынай, яна і растлумачыла, што ДТЗ адбылося тыдзень таму. Але ў любым выпадку мы ўдзячныя заяўніку, які не прайшоў міма.

На трасах нярэдка бываюць ДТЗ з дзікімі жывёламі. Праз аўтатрасу М1 яны пастаянна мігруюць. Слабая абачлівасць кіроўцаў часам вельмі дорага абыходзіцца. Наступствы могуць быць самыя розныя. **Старшы лейтэнант міліцыі Вадзім СЕРАБРАКОЎ** згадвае, як гады два з паловай таму таксіст на «Фальксвагене» збіў лася, які выпадкова выбег на дарогу. У выніку ў аўтамабіля цалкам знесла дах. А аднойчы на аўтадарозе М6 кіроўца BMW ехаў з хуткасцю 90 кіламетраў у гадзіну. Справа выбег лось. Калі б спераду сядзеў пасажыр — быў бы мёртвы. Дах склала да задняга пасажырскага сядзення, палова машыны была знявечана. Звычайная страхоўка ў такіх выпадках не дзейнічае — пагашае толькі КАСКО.

— А вось буйную сельгастэхніку мы заўжды суправаджаем, — кажа Дзмітрый Пыко. — Калі нам прыходзіць заяўка — «праводзім» ад механізаванага двара і да поля. Змена ў механізатараў заканчваецца — іх суправаджаюць назад у гаспадарку.

**«Прыязджаю, да мяне падыходзяць двое мужчын-кіроўцаў і кажуць: мы не хочам самастойна афармляць еўрапратакол, бо баімся, што нам не заплацяць пасля ў страхавой. Але на бланку ўсё паказана, як яго правільна запаўняць. Пэўна, самае складанае — гэта намаляваць схему... У выніку пацярпелы атрымаў за іншыя парушэнні большую суму, чым віноўнік. Вось такія калізіі бываюць».**

Самы «хіт» сярод здарэнняў — гэта вырваныя «з мясам» заправачныя пісталеты на аўтазапраўках. Асабліва ў спёку, у выхадныя дні, калі народ масава едзе на прысядзібныя ўчасткі. І ўсё гэта адбываецца ад банальнай няўважлівасці. Урон звычайна невялікі — вырываецца паліваразадатачны кран і рвецца муфта.

— Летась мы з напарнікам два разы ганяліся за матацыклістамі і яшчэ два — за легкавымі аўтамабілямі, кіроўцы якіх спрабавалі ўцячы з месца ДТЗ, — прыгадвае Вадзім Серабракоў. — Адзін увогуле зладзіў ралі на пешаходнай дарожцы, а пасля імкнуўся схавацца ў полі. Усіх іх мы дагналі, натуральна. Санкцыя за спробу ўцячы прадугледжвае і пазбаўленне правоў да двух гадоў.

Цікавімся, ці бывае так, што супрацоўнікаў ДАІ выклікаюць нават у тым выпадку, калі можна было б раз'ехацца па так званым еўрапратаколе. Нагадаем, што гэта магчымасць самастойна аформіць факт ДТЗ пры ліміце ўрону да 800 еўра. Разам з тым ён мае і абмежаванні. Разбірацца ў юрыдычных тонкасцях абодва кіроўцы не хочуць і лічаць за лепшае патэлефанаваць на нумар «102».

— Цяпер падчас звароту ў міліцыю заўсёды пытаюцца пра ўрон, — запэўнівае Вадзім Серабракоў. — І ў выпадку мінімальнай сумы абавязкова прапануюць магчымасць вырашыць пытанне пры дапамозе еўрапратакола. Але калі мы прыязджаем на месца ДТЗ, то сутыкаемся нярэдка з дзвюма рэчамі: у кіроўцаў або няма бланкаў, або тыя кажуць, што проста баяцца іх запаўняць, і просяць гэта зрабіць супрацоўніка ДАІ. А калі прыязджаем мы, то афармляем якраз ДТЗ. Было аднойчы, што давялося ехаць 60 кіламетраў праз увесь раён. Прыязджаю, да мяне падыходзяць двое мужчын-кіроўцаў і кажуць: мы не хочам самастойна афармляць еўрапратакол, бо баімся, што нам не заплацяць пасля ў страхавой. Але на бланку ўсё паказана, як яго правільна запаўняць. Пэўна, самае складанае — гэта намаляваць схему... У выніку пацярпелы атрымаў за іншыя парушэнні большую суму, чым віноўнік. Вось такія калізіі бываюць. Пры гэтым па тэлефонным нумары «140» кругласутачна дзейнічае агульнарэспубліканскі кол-цэнтр, дзе наконт еўрапратакола адкажуць на ўсе ўзніклыя пытанні.

Тым часам мы пад'язджаем да вёскі Слабодка. А ў кювеце — «карціна маслам». Там стаіць вялікая фура. Але ж як стаіць! Мяркуючы па слядах шын на асфальце, яна пайшла ў занос і перакруцілася на 180 градусаў адносна напрамку аўтаплыні. Да таго ж сама фура стаіць у кювеце пад тупым вуглом. У яе моцна пабіты аб дрэва бок кабіны.

— Мы тут надоўга затрымаемся, — прыкідвае Дзмітрый Пыко. — Эвакуатару работы шмат — мала таго што з кювета выцягнуць фуру, дык яшчэ і падчапіць яе за перад супраць руху. Насустрач руху мы гэты «паравозік» пускаць не маем права — тут жа ён аднабаковы, а да найбліжэйшай развязкі — кіламетры два. Таму скажам, каб «круцілі» тут, балазе ёсць заезд у бок поля. І ўвесь гэты час мы павінны тут гарантаваць бяспеку дарожнага руху. Спатрэбіцца нават часовае перакрыццё дарогі, бо інакш эвакуатар не здолее павярнуць налева. Як бачыце, падбавілі нам тут работы істотна. Але давайце паглядзім, мо, каму там дапамога патрэбна.

У кювеце каля фуры завіхаюцца некалькі чалавек. Кіроўца стаіць спераду машыны і глядзіць на сляды ад дрэва. Што і казаць, сітуацыя вельмі непрыемная. Добра яшчэ, што хоць сам не пацярпеў.

**«Самы «хіт» сярод здарэнняў — гэта вырваныя «з мясам» заправачныя пісталеты на аўтазапраўках. Асабліва ў спёку, у выхадныя дні, калі народ масава едзе на прысядзібныя ўчасткі. І ўсё гэта адбываецца ад банальнай няўважлівасці. Урон звычайна невялікі — вырываецца паліваразадатачны кран і рвецца муфта».**

— Наперадзе ехаў грузавік, — кажа шафёр. — Ён сышоў улева, і тут проста перада мной усунуўся легкавы аўтамабіль. Я пачаў тармазіць, каб не сутыкнуцца з ім. Фуру панесла, пачало кідаць з боку ў бок. Ну і што далей — самі бачыце... Добра яшчэ, што цыстэрна пустая была.

Неўзабаве пад'ехаў эвакуатар. За гэты час Вадзім Серабракоў паспеў намаляваць схему месца ДТЗ і замерыць шырыню кожнай з палос. Апошняе неабходна для таго, каб вызначыць, колькі месца для манеўру было ў кіроўцы. Супрацоўнікі ДАІ пакінулі толькі адну паласу для праезду. Тры іншыя патрэбны для работы эвакуатара.

— На малюнку ўказваецца ўся карціна, — расказвае інспектар. — Вось тут — сляды юзу, іншыя ўмоўныя абазначэнні. Непасрэдна аўтамабілі «прывязваюцца» да двух статычных аб'ектаў. У нашым выпадку — пешаходны пераход і дарожны знак... Сляды на сорак тры метры расцягнуліся! Можна сабе ўявіць, што было на трасе. Малюнак пасля прыкладваецца да матэрыялаў справы. Па ім пасля можна будзе выставіць прыкладнае размяшчэнне аўтамабіляў, як цяпер, калі ўзнікне неабходнасць следчага эксперымента. Паколькі кіроўца цвярозы, то неабходнасці ў загоне фуры на штрафстаянку няма. Таму яе адбуксіруюць да ўладальніка, ну а пасля ўжо няхай гаспадар вырашае, што з ёй рабіць.

На месца падзей прыехаў і кіраўнік прадпрыемства, якое займаецца эвакуацыяй фур.

— Машына стаіць у вельмі нязручным становішчы, так званых «нажніцах», — каментуе сітуацыю Аляксандр Цыганоў, назіраючы за работай невялікага, але вельмі магутнага эвакуатара. — Тут у нас яшчэ і вялікі перапад самога кювета. Таму, каб дастаць машыну, яе трэба развярнуць. Вось гэта зараз і робіць наш кіроўца. Цяпер наша задача — выцягнуць на цвёрдую паверхню цыстэрну. Ну а «галава» аўтаматычна падцягнецца ззаду. Нам трэба прычыніць мінімальны ўрон і дарожнаму пакрыццю, і самому аўтамабілю. Насамрэч, фуры ў кювеце — не такая рэдкая для нас сітуацыя. Аднойчы мы выцягвалі падобны аўтамабіль амаль дванаццаць гадзін. Там, праўда, была да таго ж і балоцістая мясцовасць. Тут усё-такі задача прасцейшая, хоць і не элементарная.

Аперацыя па пад'ёме фуры з кювета заняла каля трох гадзін. Новых выклікаў у супрацоўнікаў ДАІ няма. Наперадзе ў іх — яшчэ некалькі гадзін патрулявання прысталічнага раёна.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Тэма

# «СТВАЛЫ» ПАД КАНТРОЛЕМ

## Як правяраецца захоўванне зброі?

**Спрадвеку паляванне лічылася мужчынскім заняткам, па сутнасці, такім і засталося. Толькі мэты яго з часам змяніліся. Але нягледзячы на тое, што паляванне з даўніх часоў існавала ў сельскай мясцовасці, не забыта яно і сярод жыхароў вялікага горада.**

**Цяпер у Заводскім раёне Мінска зарэгістравана паўтары тысячы паляўнічых. І гэта на 233 тысячы агульнага насельніцтва. Лічба даволі істотная, асабліва калі ўлічыць, што абавязковы атрыбут паляўнічага — уласная зброя. І кантроль за яе захаваннем павінен быць вельмі жорсткі.**

**Як гэта адбываецца, карэспандэнт «Звязды» ўбачыў на свае вочы разам са старшым інспектарам па дазваляльнай рабоце Заводскага РУУС Мінска маёрам міліцыі Юліяй ІВАНОВАЙ.**

### «ПАЎТАРЫ ТЫСЯЧЫ ПАТРОНАЎ ЛЯЖАЛА НА АНТРЭСОЛЯХ»

— У першую чаргу супрацоўнікаў міліцыі цікавіць парадак захоўвання. Трэба, каб зброя знаходзілася непасрэдна ў зачыненым металічным сейфе. А да яго і ключоў павінен быць выключаны вольны доступ. Патронам месца — толькі на асобнай палічцы ў сейфе. Бывалі ў нас выпадкі, калі ключы ад сейфа віселі проста каля ўваходных дзвярэй... Нядаўна адзін з нашых участковых выкрыў факт, калі ў кватэры ружжо захоўвалася без сейфа. Быў складзены адміністрацыйны пратакол, а гаспадара мы папярэдзілі пра тое, што наступны раз зброю за гэта ў яго адбяруць. Калі ж чалавек захоўвае некалькі адзінак зброі, то або яны павінны ляжаць у сейфе, разлічаным на такую колькасць, або пад кожную з іх мусіць быць адведзены спецыяльны сейф. І ў сярэднім раз на тыдзень адзін з паляўнічых і застаецца праз парушэнні правіл захоўвання без зброі.

***— Якія дакументы трэба збіраць для таго, каб законна набыць стрэльбу?***

— Раз на тры гады грамадзяне павінны працягнуць тэрмін дазволу на захоўванне і нашэнне зброі. За месяц да канца дзеяння яны мусяць звярнуцца ў дазвольную сістэму з пэўным пакетам дакументаў. Гэта медыцынская даведка аб тым, што ў чалавека няма проціпаказанняў для валодання зброяй, квітанцыя аб аплаце і дзеючае пасведчанне на права палявання. І, натуральна, сам дазвол на набыццё і нашэнне зброі. Калі ж чалавек у гэты тэрмін не ўклаўся — мы зброю адбіраем і даём месяц на тое, каб недахопы былі ліквідаваны. Ну і заадно будзе складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Няпамятлівасць каштуе ад 4 да 15 базавых велічынь.

***— Але што рабіць, калі гаспадар зброі памёр?***

— У канцы студзеня да нас звярнуўся чалавек. Ён расказаў, што пасля смерці маці вырашыў зрабіць рамонт у кватэры, дзе яна жыла. І знайшоў на антрэсолях паўтары тысячы патронаў і штык-нож да аўтамата Калашнікава. Зброя была адабрана. Пасля высветлілася, што бацька заяўніка калісьці працаваў ваенруком у школе, яшчэ за савецкім часам, і меў доступ да боепрыпасаў. Пры гэтым сам ён ніколі паляўнічым не быў. Памёр яшчэ ў 2002 годзе. І ўвесь гэты час патроны ляжалі ў кватэры. Прычым было высветлена, што яны цалкам прыдатныя. І тут важна звярнуць увагу на наступны момант: калі зброя здаецца добраахвотна, то ніякай адказнасці для таго, хто яе здаў, няма.

***— А ці валодаюць зброяй жанчыны?***

— Так, іх у Заводскім раёне сталіцы чатыры. Цяга да зброі звычайна з'яўляецца пад уплывам мужоў. А вось куды больш пенсіянераў, якія валодаюць зброяй. Нядаўна ў нас атрымаў трохгадовы дазвол уладальнік, які нарадзіўся ў 1937-м! І гэта яшчэ не рэкорд. Тры гады таму дазвол паспяхова падоўжыў 87-гадовы пенсіянер. Сёлета, калі яму споўнілася 90, на жаль, гэта зрабіць ужо не атрымалася. Але не трэба думаць, што ўсе яны ходзяць у такім паважным узросце на паляванне. Бывае не раз, што ў такіх людзей зброя нерухома ляжыць у сейфе па 10—15 гадоў. Проста яна дарагая чалавеку, і з асабістых прычын ён з ёй развітвацца не хоча. У такім выпадку рана ці позна, але ў нейкі момант дазвол працягнуты не будзе, і зброю давядзецца здаць. Таму тут ёсць альтэрнатыўны варыянт: спецыялізаваная сталічная майстэрня выводзіць зброю з баявога стану. Але пасля трэба будзе звярнуцца ў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, каб яны пацвердзілі, што з гэтай зброі страляць больш нельга.

### АД ПАПУЛЯРНАЙ «ТУЛКІ» ДА БЕЛЬГІЙСКАЙ РЭДКАСЦІ

Спярша мы кіруемся ў пасёлак каля сталічнага аўтазавода. Там на адлегласці літаральна 100 метраў адзін ад аднаго жывуць адразу два паляўнічыя.

Першы з іх, Валерый Яўгенавіч, актыўна рыхтуецца да цёплага сезону. Ужо падрыхтаваў надзіманую лодку. Двое ружжаў у яго ляжаць у розных сейфах. Юлія Іванова просіць паказаць боепрыпасы. Яны знаходзяцца асобна на паліцах. Дазвол на захоўванне, нашэнне зброі і паляўнічы білет у мужчыны схаваны надзейна, зрэшты, як і ключ. Усе нумары, якія нанесены на розныя часткі зброі, супадаюць.

— Участковы да мяне часта заходзіць, каб зброю праверыць. Сёлета ўжо два разы быў, — згадвае Валерый Яўгенавіч. — Але за трыццаць гадоў паляўнічага стажу я ўжо да гэтага прывык. Адзінае — калі быў жывы цесць, то ездзіў з ім на паляванне часцей. Ды і тата мой таксама сябраваў са зброяй.

А вось Іван Іванавіч вырашыў са сваёй зброяй развітацца. 22 мая ў мужчыны заканчваецца тэрмін дзеяння дазволу, і падаўжаць яго ён не плануе. Хоць са сваім ТОЗам не развітваецца яшчэ з 1990 года.

— Не, сваё я ўжо адпаляваў... Ужо недзе сем гадоў не хаджу. Тры гады таму падоўжыў дазвол, але бачу, што гэта марна ўсё. А ружжо давядзецца здаць.

Тут трэба ўдакладніць адну асаблівасць, якая датычыцца розных дакументаў. Пасведчанне, якое дазваляе менавіта паляванне, выдаецца на дзесяць гадоў, а не на тры, як у выпадку з захоўваннем зброі. Але калі падчас часовага трохгадовага тэрміну скончылася дзеянне паляўнічага білета, то зброю дома трымаць можна, вось толькі страляць з яе нельга.

...Бывае, што занятак нейкай справай пераходзіць ад бацькі да сына. Паляванне — не выключэнне. Так адбылося ў Віктара і Аляксандра. Больш за тое, падчас размовы з Аляксандрам бачна, што мужчына цудоўна ведае гісторыю сваёй зброі.

— Мы карыстаемся ружжамі Browning. У нашай краіне яны вельмі рэдкія. Зроблены ў 1969 і 1973 гадах у Бельгіі пад замову. Адрозніваюцца тым, што ў іх вельмі добрая кучнасць і трывалая сталь. Але з 1975 года гэтая серыя была цалкам знята з вытворчасці, што, безумоўна, павышае іх каштоўнасць. У таты стаж з 1993 года, у мяне — з 2009-га. Выязджаем не так часта, як хацелася б, але адкрыццё і закрыццё сезона не прапускаем ніколі.

А вось у Яўгена захоўваецца максімальна дапушчальная колькасць ствалоў — тры.

— У мяне захапленняў некалькі, — усміхаецца мужчына. — У паляванні я навічок, мой стаж налічвае ўсяго толькі год. Але ў мясцовасці, адкуль я родам, паляўнічых шмат. Затое ў Мінску мы з сябрамі перыядычна наведваем спортынг-клуб, прыкладна раз на тры месяцы. Пасля рабочага тыдня пастраляць па талерачках — што можа быць лепей? Акрамя таго, я — даўні член ДТСААФ, займаюся стральбой з пісталета. Праўда, туды я прыйшоў ужо пасля 30...

У нашага апошняга героя, Віталя Якаўлевіча, зарэгістраваны сапраўдны рарытэт. Нямецкае ружжо Simson ён называе «графскім». Яно і нядзіўна — зброя маркі не выпускаецца з 1945 года. Як жа такое ружжо трапіла ў Мінск?

— Я яго набыў у Манголіі ў 1989 годзе. У азіяцкай краіне я настаўнічаў у савецкай школе ва Улан-Батары — выкладаў гісторыю і грамадазнаўства. Там жа пасябраваў з нашым земляком Уладзімірам, які працаваў у гандлёвым прадстаўніцтве, але жыў у Маскве. У сталіцы СССР яго кватэра знаходзілася на адной пляцоўцы з жыллём нейкага генерала. Генерал той меў вось гэта самае ружжо, але паляваць асабліва не ўмеў, ды і жаданнем навучыцца не палаў. І вось аднойчы ён і прапанаваў Уладзіміру купіць гэтую зброю. Казаў, што страляе яна кучна і на вельмі далёкую адлегласць. А яшчэ яна, маўляў, належала нейкаму графу. Уладзімір ведаў, што я да палявання нераўнадушны, і спытаў мяне, ці не хачу купіць ружжо. Я пагадзіўся, балазе грошы былі...

* * *

Парушэнняў падчас рэйду мы не знайшлі. Але засталося нявысветленае адно пытанне — ці шмат жыхароў Заводскага раёна сталіцы валодаюць пнеўматычнай і газавай зброяй?

— Пнеўматыка ставіцца на ўлік, калі мае дульную энергію, большую за 7,5 джоўля. У нас зарэгістравана ўсяго адна такая адзінка. Што да газавых пісталетаў, то даніна модзе, якая існавала ў 90-я гады, амаль сышла ў гісторыю. Уладальнікі пакрысе прыносяць іх на ўтылізацыю. Толькі дзве штукі летась мы перарэгістравалі ў спадчыну — з бацькоў на сыноў. Бацькі развітвацца са зброяй не хацелі, а медыцынскую камісію прайсці не здолелі.

Акрамя таго, усе ўладальнікі зброі пастаянна правяраюцца на прадмет парушэння закону. Калі біяграфія не зусім «чыстая» — прыладу тут жа канфіскуюць. І сёлета ў Заводскім раёне былі ўжо тры такія выпадкі. На працягу года стрэльбу ці іншую прыладу можна прадаць, перааформіць або падарыць. Калі ж чалавек гэтай магчымасцю не скарыстаўся — зброю адбяруць у даход дзяржавы. Таму парушаць закон уладальніку зброі вельмі і вельмі накладна ва ўсіх сэнсах.



— Увесну 2014 года ў нас праходзіла традыцыйная аперацыя «Арсенал». Гэта падстава яшчэ раз праверыць збройнікаў, — згадвае **старшы інспектар аддзела аховы і правапарадку Заводскага РУУС Мінска маёр міліцыі Уладзімір ЛАГУНЧЫК.** — Шэсць гадоў таму я працаваў участковым інспектарам. Дык вось, вырашыў я зайсці да аднаго паляўнічага, які меў зарэгістраванае гладкаствольнае ружжо. Ён спачатку не хацеў мяне пускаць у кватэру. Толькі пасля папярэджання, што ў яго адбяруць ружжо, адчыніў дзверы. Мужчына крыху адчыніў дзверцы сейфа і кажа — бачыце зброю? Маўляў, усё добра, і тут жа зачыняе назад. А я разумею: паводзіны яго, скажам так, нетыповыя. Здавалася б, чаго яму хвалявацца, калі ўсё ў парадку? Папрасіў я ў яго ключы, сам адчыніў гэты сейф. Думаў, можа, нешта з патронамі не тое. Аказалася, што ў зброі ніякіх патронаў няма, усе боепрыпасы ляжаць асобна на паліцы. Дык чаго ж так нервавацца было? Гляджу я на сейф і разумею, што ён нейкай незвычайнай канструкцыі. Так і аказалася — ён меў двайное дно. А на другім «узроўні» ляжаў нейкі пакет. Дастаю я яго, разгортваю — а там нейкі старадаўні пісталет і патроны. Пасля высветлілася, што пісталету было больш за сто гадоў. І такіх экзэмпляраў у свеце засталося ўсяго некалькі! Праўда, стан яго аказаўся нерабочы. А вось патроны прыдатнасць да стральбы захавалі. Таму і была заведзена крымінальная справа па артыкуле 295 Крымінальнага кодэкса. Наш герой атрымаў два гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота дадзена Заводскім РУУС.**

# РЭНЕСАНС СТАРОГА ЗАМКА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Трэба сказаць, што менавіта форма купала выклікала нямала спрэчак. Першапачатковы праект, які прапанаваў архітэктар Уладзімір Бачкоў, засноўваецца на старажытнай гравюры Макоўскага. На ёй купал замка мае форму шара. Да абмеркавання далучыліся спецыялісты з Польшчы, якія мелі вопыт рэканструкцыі замкаў. Яны прапанавалі больш выцягнуты варыянт. Урэшце кампраміснае рашэнне ў рамках беларуска-польскай камісіі было знойдзена і паспяхова ўвасоблена ў жыццё.

## ІМПЕРАТАРЫ І СТЭФАН БАТОРЫЙ

Замак праходзіць рэканструкцыю пад эпоху Рэнесанса, калі каралём Рэчы Паспалітай быў Стэфан Баторый. У 1580-х гадах манарх стварыў тут сваю рэзідэнцыю,ператварыўшы былыя руіны ў прыгожы палац. Праўда, да нашых часоў замак дайшоў у выглядзе шэрых будынкаў, і гаворка пра яго рэканструкцыю вялася дзесяцігоддзямі.

**Рэканструкцыя хоць і не так хутка, але рухаецца наперад. Усе спрэчкі, якія вяліся даволі доўгі час, нарэшце сціхлі.**

Нарэшце ў 2017 годзе канчатковы праект быў зацверджаны. З таго часу замак пачаў імкліва рушыць у каралеўскую эпоху XVI стагоддзя. У памяць пра былога ўладальніка на ўязной вежы з'явіўся яго партрэт. Насамрэч у тыя часы такіх выяў на самой вежы не існавала. Затое нешта падобнае — у стылі сграфіта — захавалася на тыльным баку замка.

Такая тэхніка характэрна для Рэнесансу. Элементы сграфіта сустракаюцца на некаторых старажытных будынках, напрыклад на Брыгіцкім касцёле ў Гродне і на вежы Лідскага замка. Майстар наносіць на сцяну слой каляровай тынкоўкі, а зверху — белую, потым вырazae патрэбны малюнак. Такім чынам на вежы Старога замка з'явіліся профільныя партрэты ў медальёнах, грыфоны і раслінны арнамент. Па перыметры размешчана 12 партрэтаў. Усе яны, акрамя партрэта Стэфана Баторыя, належаць рымскім імператарам.

## ГЭТА НЕ ПРОСТА БУДОЎЛЯ...

Маштабны праект датычыцца не толькі рэканструкцыі замка. На яго тэрыторыі праведзены археалагічныя раскопкі, знойдзена нямала каштоўных артэфактаў. Для шырокага агляду будуць даступны фрагменты так званай Верхняй царквы, якая 80 гадоў захоўвалася каля сцен замка. Для старажытнай пабудовы будзе зроблены асобны павільён.

Пастаянна ідуць работы па дэкарыраванні будынка. І хоць тэрыторыя нагадвае вялікую будоўлю, замак ужо набывае рысы велічнага палаца. Карціна паступова складваецца. Для гэтага давялося штосьці дабудаваць, змяніць... Напрыклад, з'явілася так званая камяніца, дзе ў будучым размесцяцца музейныя экспанаты. Рэканструкцыя хоць і не так хутка, але рухаецца наперад. Усе спрэчкі, якія вяліся даволі доўгі час, нарэшце сціхлі. Бо зразумела, што такі падыход не дасць вынікаў, а замак сапраўды меў патрэбу ў рэканструкцыі.

Пры гэтым увесь ход работ даволі празрысты. Кожны, хто пажадае, можа быць у курсе падзей і нават задаць сваё пытанне начальніку ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алене Клімовіч, якая стварыла суполку «Стары замак — Гродна» ў «Фэйсбуку». Нядаўна яна паведаміла, што першая чарга рэканструкцыі павінна быць завершана сёлета. Актуальнае пытанне на сённяшні дзень — пошук майстроў для ўнутраных работ: тых, хто будзе ствараць жывапісныя элементы, металічныя, драўляныя вырабы, ляпніну. Цяпер, напрыклад, задзейнічаны прадпрыемствы па вытворчасці каменных элементаў, вітражоў, керамікі. Алена Клімовіч неяк прызналася, што рэканструкцыя замка — гэта не проста будоўля, гэта праект па ўзнаўленні каралеўскай пабудовы, над ажыццяўленнем якога працуюць цэлыя інстытуты, задзейнічаны дзясяткі прадпрыемстваў.

**Актуальнае пытанне на сёння — пошук майстроў для ўнутраных работ: тых, хто будзе ствараць жывапісныя элементы, металічныя, драўляныя вырабы, ляпніну.**

Наперадзе яшчэ два этапы работ. Самым важным з іх стане непасрэдна рэстаўрацыя палаца Стэфана Баторыя. Трэба вызначыцца, як будуць выглядаць парадны ўваход, залы прыёму караля. На чарзе — рэстаўрацыя флігеля адміністратара: будынак таксама будзе ўзводзіцца нанова. Перад гэтым пройдуць археалагічныя раскопкі. Безумоўна, рэканструкцыя патрабуе немалых сродкаў. Ці хопіць іх на тыя работы, што запланаваны на гэты год? Алена Клімовіч паведаміла, што грошы на першую чаргу выдаткоўваліся з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Увогуле гэта поўнасцю дзяржаўны праект. Сёлета выдаткаванні пойдуць на комплексна-навуковыя даследаванні, якія будуць выкарыстоўвацца пры праектаванні другой чаргі рэканструкцыі замка. Але гэта ўжо планы будучага года. Ва ўсякім разе, «замарожваць» аб'ект ніхто не збіраецца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Падкормка парэчак, маліны і агрэсту вясной



**Кусты малін, парэчак і агрэсту растуць практычна на кожным участку. Яны не патрабуюць нейкага адмысловага догляду: абразанне галінак і падкормка раз на год дазваляюць кожнае лета атрымліваць прыстойны ўраджай.**

## МАЛІНЫ

Перш чым прыступіць да падкормкі малін, выдаліце падмерзлыя галінкі з кустоў, збярыце сухія лісты і траву, пазбаўцеся ад пустазелля. Пустазелле вакол малін выдаліце рукамі (не выкарыстоўвайце рыдлёўку), бо ў іншым выпадку вы можаце пашкодзіць карэньчыкі, якія знаходзяцца блізка да паверхні.

Пасля праведзенай работы растварыце ў 10 літрах вады пару лыжак экафоскі або азафоскі і паліце атрыманым растворам маліну з разліку літр-паўтара на куст. Калі ёсць арганіка, выкарыстоўвайце для палівання кустоў наступны раствор: развядзіце ў вадзе гной (1:10) або курыны памёт (1:20).

Выдатным азотным угнаеннем для малін з'яўляецца настой пустазелля (вядро пустазелля заліваецца вадой, настойваецца 5-7 дзён у цёплым месцы, працэджваецца). Перад палівам кустоў гэтым настоем рэкамендуецца пад кожны куст унесці па шклянцы драўнянага попелу.

Адразу пасля правядзення падкормкі пажадана правесці мульчыраванне кампостам, торфам або паўраскладзеным гноем (пяцісантыметровага пласта будзе дастаткова). Такая працэдура дапаможа захаваць вільгаць у глебе, а таксама прыцягне дажджавых чарвякоў, якія, у сваю чаргу, «паклапоцяцца» аб рыхленні грунту.

## АГРЭСТ

Падкормку агрэсту праводзяць адразу пасля раставання снегу — у гэты перыяд зямля вільготная і карані кустоў змогуць выдатна засвоіць усе пажыўныя рэчывы. Калі кусты досыць маладыя, пад кожны з іх насыпце па пары сталовых лыжак нітрафоскі і па шклянцы драўнянага попелу, калі дарослыя — у два разы больш.

Пры наяўнасці гною абкладзіце ім кожны куст па крузе пластом таўшчынёй некалькі сантыметраў. Зрабіць гэта можна, не чакаючы поўнага раставання снегу. Памятайце: агрэст, маладзейшы за тры гады, не мае патрэбы ў падкормцы (асабліва калі пры яго пасадцы была ўнесена ў глебу дастатковая колькасць угнаенняў).

## ПАРЭЧКІ

Ураджай парэчак залежыць ад іх сорту і догляду кустоў. Асабліва важнае значэнне мае падкормка. Двухгадовыя і маладзейшыя кусты не маюць патрэбы ў падкормцы, чаго не скажаш пра трохгадовыя і старэйшыя. Пры недахопе пажыўных рэчываў лісце парэчак развіваецца павольна, не дасягае буйных памераў і мае слабейшую афарбоўку (светла-зялёную).

Калі ў папярэдні год вы заўважылі на кустах падобныя прыкметы, то абавязкова вясной падкарміце іх: унясіце альбо 10 грамаў мачавіны, альбо 15 грамаў аміячнай салетры на квадратны метр. Вышэйапісаную падкормку можаце замяніць растворам гною, змешанага з вадой у суадносінах 1 да 8, каравяку (1:5), птушынага памёту (1:10, 1:12). Вельмі важна пасля прыгатавання раствору даць яму настояцца пару дзён, а затым ужо паліваць парэчкі з разліку адно вядро на 3-4 кусты.

# ПАЛІЎ РАСАДЫ ПАМІДОРАЎ ПАСЛЯ ЎСХОДАЎ

**Першыя тыдні пасля ўсходаў таматы вельмі востра рэагуюць на празмернасць або недахоп вільгаці ў глебе. Каб не загубіць расліны, трэба правільна іх паліваць, выкарыстоўваючы для гэтага чыстую ваду пакаёвай тэмпературы.**



Пасля пасадкі насення таматаў неабходна падтрымліваць вільготнасць грунту для культуры на ўзроўні 85-90 працэнтаў. Вышэйшая і ніжэйшая лічбы могуць негатыўна адбіцца на пасадках (насенне альбо высахне, альбо загніе). Вельмі важна, каб такая вільготнасць заставалася толькі да прарастання насення, у далейшым яе неабходна панізіць.

Як толькі на паверхні грунту з'явяцца парасткі, увільгатненне глебы трэба спыніць дні на тры, каб лішняя вільгаць не загубіла саджанцы. Справа ў тым, што маленькія расліны вельмі схільныя да грыбковых захворванняў, і толькі змяншэнне вільготнасці можа дапамагчы ім пераадолець гэты складаны перыяд.

Да моманту, як у расады з'явяцца па дватры сапраўдныя лісточкі, паліваць яе варта не часцей, чым раз на пяць-сем дзён, але кожны раз пры паліве варта добра прамочваць грунт. Пасля таго як лісточкі з'явяцца, неабходна правесці пікіроўку саджанцаў, а ў далейшым колькасць паліву павялічыць удвая, то-бок праводзіць працэдуру не менш за два разы на тыдзень.

Колькасць вады для паліву кожнай расліны залежыць ад ёмістасці, у якой культура знаходзіцца. Важна выкарыстоўваць столькі вады, каб яна дасягала дна посуду. Гэта лёгка адсачыць пры вырошчванні расады ў кантэйнерах з адтулінамі для дрэнажу.

***ВАЖНА:** празмернае пераўвільгатненне глебы негатыўна адбіваецца на таматах, таму, каб захаваць расаду, варта больш старанна сачыць за вільготнасцю грунту і паліваць саджанцы толькі па меры неабходнасці.*

# Чым і калі апрацаваць клубні бульбы перад пасадкай

**Для большасці земляробаў бульба застаецца адной з галоўных агароднінных культур, і ад таго, як будуць падрыхтаваны яе клубні да пасадкі, наўпрост залежыць будучы ўраджай.**



Сучасны падыход вырошчвання «другога хлеба» дазваляе паменшыць плошчу вырошчвання і пры гэтым атрымаць нават большы ўраджай.

Апрацоўваюць насенне бульбы за 15—45 дзён да планаванай пасадкі. Чым раней клубні будуць падрыхтаваны, тым хутчэй яны прарастуць у глебе.

Пачынаюць з прагравання насеннай бульбы. Яе дастаюць са склепа, аглядаюць і вытрымліваюць суткі для таго, каб клубні сагрэліся. Апрацоўку пажадана правесці адразу — гэта больш эфектыўна, чым напярэдадні пасадкі ў глебу. Выкарыстоўваюць розныя растворы, а самы даступны і карысны будзе такі.

У 10 л вады раствараюць па 2 г (1/3 чайнай лыжкі) меднага купарвасу і марганцоўкі, 20 г (1 сталовую лыжку) любога комплекснага мінеральнага ўгнаення. Вада павінна быць цеплаватая, каб угнаенні растварыліся. Клубні апускаюць у прыгатаваны раствор на 30-45 хвілін. Затым іх раскладваюць у адзін пласт і пакідаюць на святле (не на сонцы) для яравізацыі вочкаў. У такі раствор карысна дадаць угнаенні на аснове магнію (магбор) і цынку па 1/3 чайнай лыжкі, бо яны важныя для абароны гэтай культуры ад фітафторы і паршы.

Пры праклёўванні вочкаў у клубняў могуць праявіцца розныя балячкі. Такія бульбіны адбракоўваюць. У працэсе прарошчвання бульбы яе рэгулярна апырскваюць вадой з дабаўленнем стымулятараў росту, гуматаў.

Правільна падрыхтаваныя клубні маюць у час пасадкі тоўстыя моцныя парасткі з зялёнай верхавінкай і не абломваюцца.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**1 КРАСАВІКА**

**У краіне**

**1940** год — нарадзіўся Уладзімір Самойлавіч Басалыга, беларускі графік. Сярод работ — ілюстрацыі да кнігі «Мая Іліяда» Уладзіміра Караткевіча, альбома «Гравюры Францыска Скарыны», серыі графічных твораў «Мірскі замак», «Нясвіжскі замак», «Слуцкая гімназія» і іншыя.

**1950** год — нарадзіўся Дзмітрый Юр'евіч Ландо, беларускі біяфізік, доктар біялагічных навук (1989), прафесар (1996). Заслужаны вынаходнік СССР (1988). Аўтар навуковых прац па біяхіміі і біяфізіцы дэзаксірыбануклеінавай кіслаты (ДНК).

У той жа дзень створаны аркестр штаба Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Цяпер гэта Галоўны ваенны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У рэпертуары арыгінальныя п'есы і аранжыроўкі твораў беларускіх кампазітараў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1972).



**1960** год — нарадзілася Святлана Барысаўна Вількіна, беларуская спартсменка і трэнер (шатакан каратэ-до), заслужаны майстар спорту Беларусі (1999). Суддзя нацыянальнай (1994) і міжнароднай (1998) катэгорыі. Чэмпіёнка (1997, 1999, 2000, 2001, 2002, 2005), сярэбраны (1997, 2000, 2002, 2005) і бронзавы (1997, 1999, 2001, 2005) прызёр чэмпіянатаў свету. Чэмпіёнка Еўропы (1998, 2001, 2003, 2004).

**У свеце**

**1840** год — нарадзіўся Іларыён Міхайлавіч Пранішнікаў, рускі мастак-перасоўнік, член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Аўтар жанравых карцін «Жартаўнікі», «Паражнякі».



**1905** год — нарадзіўся Алег Пятровіч Жакаў, рускі акцёр, народны артыст СССР (1969). З 1925-га здымаўся ў кіно. Сярод фільмаў — «Сямёра смелых», «Мы з Кранштата», «Дэпутат Балтыкі», «Каля возера» і іншыя. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1946), Дзяржаўнай прэміі Расіі (1979).

**1920** год — заснавана Літоўскае агенцтва навін ELTA.

**1950** год — высаджана на лёд дрэйфуючая станцыя «Паўночны полюс — 2» пад кіраўніцтвам Міхаіла Сомава. Станцыя прабыла на лёдзе 376 дзён і была эвакуіравана 11 красавіка 1951 года.

**1980** год — у горадзе Лусака (Замбія) была ўтворана Канферэнцыя па каардынацыі развіцця краін поўдня Афрыкі.

**1995** год — пачаў вяшчанне канал «Грамадскае расійскае тэлебачанне» (цяпер ААТ «Першы канал»).

**Так гаварыў...**

**Янка КУПАЛА:**

*«Хай злыдні над намі скрыгочуць зубамі —*
*Любі сваю ніву, свой край*
*І колькі ёсьць сілы, да самай магілы*
*Ары, барануй, засявай!»*

---

Кніжны рэйтынг

# СЛОНІМСКІЯ ПАШТОЎКІ І ХРЫСТОС У ГАРОДНІ

**У сістэме кніжнага гандлю ААТ «Белкніга» 101 кнігарня. З іх 12 — у Гродне і Гродзенскай вобласці. Акрамя таго, што кнігарні працуюць у абласным цэнтры, ёсць яшчэ крамы ў Лідзе, Ваўкавыску, Шчучыне, Бярозаўцы (гэта Лідскі раён) і Слоніме (летась была адчынена крама «Санет» — якраз напярэдадні Дня беларускага пісьменства).**

ААТ «Белкніга» вырашыла падвесці вынікі рэйтынга кніг, якія карыстаюцца найбольшым попытам менавіта ў кнігарнях гродзенскага філіяла галоўнай гандлёвай сеткі дзяржаўнага кніжнага гандлю. Што ж часцей за ўсё набываюць у Гродне і Гродзенскай вобласці? На гэта пытанне адказвае **генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Аляксандр ВАШКЕВІЧ:**

— Часцей за ўсё пакупнікі, аматары кніжнага чытання, набывалі на Гродзеншчыне філакартычны альбом Уладзіміра Ліхадзедава «Слонім. Падарожжа ў часе», у якім змешчана процьма рэпрадукцый старых паштовак. Гэта вядомы праект з серыі «У пошуках страчанага», які выходзіць ужо ці не другое дзесяцігоддзе і сёння налічвае дваццаць пяць ці нават болей тамоў. На другім месцы — выдадзены мінскім выдавецтвам «Папуры» раман класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні (Евангелле ад Іуды)».

Каменціраваць наўрад ці што варта. Ясна адно: гродзенцы і візуальна, і ў чытанні — на баку добрай, асветніцкай літаратуры. Такі прыклад не можа не радаваць.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Казачны сакавік ад «Мастацкай літаратуры»

**Айчынныя выдаўцы зрабілі ўнікальны сямейны падарунак самым юным чытачам і іх бацькам. У «Мастацкай літаратуры» штомесяц выходзіць зборнік казак «на кожны дзень».**

— Ідэя кнігі заключаецца ў тым, — расказвае **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК,** — што колькі дзён у месяцы, столькі казак уваходзіць у чарговы зборнік. Усяго сёлета мы іх выдадзім дванаццаць. Выдаём кнігі казак на дзвюх мовах — на рускай і беларускай. Калі казка мае вялікі памер, то раскладаем яе на некалькі дзён знаёмства. Напрыклад, славуты твор «Пунсовая кветачка» класіка рускай літаратуры Сяргея Аксакава раім прачытаць за тры дні. Ілюстрацыямі да твораў, сабраных у зборніку «Дванаццаць месяцаў», служаць графічныя работы, малюнкі з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Дызайн кнігі зрабіла Насця Капульцэвіч.

Хто ж дапамагае бацькам ажыццявіць казачнае выхаванне дзетак у сакавіку — паводле праекта «Мастацкай літаратуры» «Дванаццаць месяцаў. Кніга 3»? Якуб Колас (змешчана створаная ім апрацоўка беларускай народнай казкі «Гарошак»), Алесь Якімовіч, Аляксей Талстой, Максім Горкі, Уладзімір Дубоўка, Карней Чукоўскі, Уладзімір Караткевіч, Максім Танк, Лідзія Арабей, Сяргей Аксакаў, Расціслаў Бензярук, Вісарыён Гарбук, Міхась Пазнякоў, Дзмітрый Мамін-Сібірак, Рэдзьярд Кіплінг, Георгій Марчук, Канстанцін Ушынскі, Васіль Вітка, Ганс Крысціян Андэрсен.

Праект, прыдуманы ў «Мастацкай літаратуры» (укладальнікам зборнікаў выступае Алесь Бадак), уражвае сваёй шматабсяжнасцю. За дванаццаць месяцаў з кніг вырастае сапраўдная бібліятэка, якую, як на мой погляд, нялішне было б мець у кожнай хаце беларусаў.

Наклад выдання — 1500 экзэмпляраў.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

---

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.41 | 19.46 | 13.05 |
| Віцебск | 6.30 | 19.37 | 13.07 |
| Магілёў | 6.32 | 19.36 | 13.04 |
| Гомель | 6.30 | 19.31 | 13.01 |
| Гродна | 6.57 | 20.01 | 13.04 |
| Брэст | 6.59 | 20.00 | 13.01 |

## Месяц

***Першая квадра ў 13.20. Месяц у сузор'і Рака.***

## Імяніны

***Пр.** Дар'і, Матроны, Сафіі, Дзмітрыя, Івана, Інакенція.*
***К.** Гражыны, Макара.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




---

## УСМІХНЕМСЯ

**— Як я вас пазнаю?**
**— Вам насустрач будзе ісці дзяўчына, і вы падумаеце: «Божа, хоць бы не яна!» Вось гэта і буду я.**

Калі дзяўчына кажа вам: «Ідзі знайдзі іншую, лепшую за мяне!» — гэта значыць, што вы павінны адказаць: «Мне ніхто не патрэбен, акрамя цябе!» А не ўцякаць з крыкам «Ура!»

**— Я аддала табе найлепшыя гады майго жыцця! — сварыцца жонка на мужа.**
**— Не палохай мяне, няўжо наперадзе яшчэ і горшыя?**

— Тата, я дзяўчына, а не пасудамыйка!
— Ды што ты кажаш! Я таксама тата, а не банкамат!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1274.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 сакавіка 2020 года.